НЕ ЗАДЕРЖИВАЙ
I-б. "Савецкая Беларусь"
Москва, Моховая, 3 Публичной библиотеке СССР им. Ленина
отд. обмен. адвін экз.

ДА ХОД КАНВЭЕРУ ЗАГАТОВАК!

„Ніводнага цэнтнэру збожжа пэ-ватнику" (ЦК УсеКП(б)

Пралетарыі ўсіх краёў, злучаецеся!

פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניגט זיך!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

НЯДЗЕЛЯ
25 кастрычніка 1931 г.
№ 248 (3337)

Усе сілы, усю энэргію на бальшавіцкае выкананьне плянаў загатовак!

БССР выканала на 20 кастрычніка толькі 36,6 проц. гадавога пляну збожжазагатовак, лёнавалакна—1 проц., лёнанасеньня—27,2 проц., бульбы—20 проц., і жывёлазагатовак—7,7 пр., квартальнага пляну. Гэткае выкананьне загатовак зьяўляецца **абсалютна нездавальняючым.**

Ганебнай плямай у збожжазагатоўчай кампаніі—выкананьне **Турaўскім** раёнам толькі 10,7 проц. пляну, **Асіпавіцкім**—12,3, **Клічаўскім** — 13,5, **Бягомльскім** — 14,9, **Чэрвеньскім**—16,0, **Лельчыцкім**—20,4, **Койданаўскім**—20,1, **Любаньскім**—21,9, **Слуцкім**—22,4 і **Пухавіцкім**—24,2 проц.

Усім недапусьцімым зьяўляецца д загатовак збожжа па калгасным сэктары, які выканаў гадавы плян загатовак збожжа толькі на 28,7 проц. (на 16-X—31 г.).

Гэткае ганебнае выкананьне пляну калгасамі, як адзначае бюро ЦК КП(б)Б, тлумачыцца тым, што дырэктыва ЦК аб разгортваньні загатовак, якая абавязвала партыйныя і загатоўчыя арганізацыі па-бальшавіцку разгарнуць работу па выкананьні плянаў загатовак, дырэктыва, у якой ЦК патрабаваў рашучай барацьбы з кулацкай практыкай, складаньня збожжа фуражных балянсаў і барацьбы з разважальнямі аб нерэальнасьці плянаў загатовак—**фактычна ня выканана.**

Рад кіраўнікоў партыйных і савецкіх арганізацый накіравалі сваю энэргію на разважаньні аб нерэальнасьці, немагчымасьці выкананьня плянаў загатовак, што прывяло да фактычнай барацьбы супроць плянаў.

Існуючыя ў радзе работнікаў, у тым ліку кіраўнікоў раённых арганізацый, антыпартыйныя настроі і стаўка на самацёк у загатоўках, «якія па-сутнасьці выяўляюць кулацкую лінію і зьяўляюцца вынікам неразуменьня новых форм клясавай барацьбы і тактыкі кулака, які імкнецца, шляхам уплыву на найбольш адсталыя пласты калгаснікаў, распальваць спажывецкія настроі і тым самым разбураюць калгасы з сярэдзіны». (З паст. бюро ЦК КП(б)Б).

Значная частка калгассаюзаў недацэньвае тэй ролі, якую набывае калгасны сэктар у збожжазагатоўках, ня толькі не вядзе належнай барацьбы з кулакамі імкненьнямі раду калгасаў разбазарваць таварную прадукцыю, не вядзе барацьбы з няправільным стварэньнем розных фондаў, а наадварот «рад раённых арганізацый і кіруючых калгасных органаў (уключаючы і Белкалгасцэнтр) устанавілі ньвёрдыя нормы збожжа і бульбы для кармоў, ня лічачыся з выкананьнем плянаў загатовак» (З паст. бюро ЦК КП(б)Б).

Асобныя месцовыя арганізацыі забыліся на паказаньні ЦК УсеКП(б) аб тым, што гіганцкія посьпехі калгаснага і саўгаснага будаўніцтва ня зьнішчаюць **усіх** труднасьцяй у арганізацыі збожжазагатоўчай кампаніі.

«У калгасах маюцца індывідуалістычныя і нават кулацкія перажыткі, якія яшчэ не адпалі, але якія абавязкова павінны адпасьці з працягам часу, па меры ўмацаваньня калгасаў...» (Сталін).

З гэтымі індывідуалістычнымі перажыткамі мы сустракаемся і зараз у момант збожжазагатовак. Патураючы гэтым перажыткам, рвацтву, апартуністы разам з імі балбочуць аб нерэальнасьці нашых плянаў. Яскравым прыкладам гэтага зьяўляецца старшыня Клічаўскага райкалгассаюзу **Бэрг**, які замест мабілізацыі мас калгаснікаў на выкананьне плянаў збожжазагатовак, разважае аб нерэальнасьці плянаў і, такім чынам, становіцца на чале кулацкай агітацыі за зьніжэньне плянаў загатовак.

Маюцца факты проціпастаўленьня агульным дзяржаўным інтарэсам сваіх вузкамесьніцкіх, няправільнае стварэньне розных фондаў, складаньне дутых збожжафуражных балянсаў, як гэта мела месца ў **Чачэрскім** райкалгассаюзе і інш.

У выніку апартуністычнай практыкі, калгасы **Асіпавіцкага** раёну выканалі плян здачы збожжа дзяржаве толькі на 4,9 проц., **Лагойскага** раёну—5,4, **Кармянскага** раёну—10,4, **Чашніцкага**—11,2 і **Чавускага**—11,5 пр.

Учора намі паведамляўся аб шкодным апартуністычным установаў **Крычаўскага** райкалгассаюзу. Райкалгассаюз даў шкодную апартуністычную ўстаноўку калгасам аб тым, каб спэцыялізаваныя калгасы не здавалі дзяржаве збожжа пакуль не забясьпечаць сваіх патрэбаў, а ў Крычаўскім раёне больш паловы калгасаў спэцыялізаваны. Гэта шкодная ўстаноўка праўленьня райкалгассаюзу не атрымала адпору з боку райкому партыі і нізавых партзьвеньняў на мясцох. Дапушчаная памылка і па сёньняшні дзень ня выпраўлена, ня гледзячы на тое, што аб ёй сыгналізавала раённая газэта **«Сацыялістычны шлях».**

Гэткія апартуністычныя адносіны да важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі раду мясцовых арганізацый давялі да таго, што калгасны сэктар выканаў, як мы паказвалі ўжо вышэй 28,7 проц.

Рад раёнаў, калгасаў паказваюць прыклады бальшавіцкіх адносін да збожжазагатоўчай кампаніі. Калгасы **Шклоўскага, Прапойскага і Нараўлянскага** раёнаў перавыканалі гадавыя пляны збожжазагатовак, **Горацкі** раён мае 62 проц. выкананьня гадавога пляну, **Асьвейскі**—89, **Сураскі**—83,3, **Нараўлянскі**—62,4 і **Уваравіцкі** — 63,7 проц.

Па гэтых калгасах, па гэтых раёнах павінны раўняцца астатнія ў збожжазагатоўках.

Плян збожжазагатовак—зусім рэальны і ён павінен быць выкананы ў тэрмін.

Плян рэальны і ён будзе выкананы. Партыйныя, савецкія, калгасныя арганізацыі павінны перабудаваць сваю работу, па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць. Няма ніякага сумненьня, што клясавы вораг—кулацтва будзе ўсімі сіламі, усімі сродкамі процідзейнічаць выкананьню плянаў, ён будзе старацца і надалей распальваць ялоцкія настроі, рвацкія настроі, сама забясьпечаньне, сярод адсталых калгаснікаў. Толькі самая рашучая, бязьлітасная барацьба з кулацтвам прымусіць яго поўнасьцю і ў тэрмін здаць заданьне, толькі самая рашучая барацьба з кулацкай агентурай—правым апартунізмам і «левымі» загібамі, толькі шырока разгорнутая масавая палітычная работа сярод калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, забясьпечыць пасыняховае выкананьне плянаў.

Ні ў якім разе, ні на адну хвіліну нельга выпускаць з-пад увагі тэй вялізарнейшай работы, тэй вялікай важнасьці гаспадарча-палітычнай кампаніі па выкананьні загатовак сярод індывідуальнага сэктару. Работа кожнай партарганізацыі, работа кожнага сельсавету, работа калгасных арганізацый павінна расцэньвацца тым, як гэтыя арганізацыі на справе арганізуюць масы, як яны вядуць барацьбу за пасыняховае выкананьне загатовак усіх відаў.

Мы сёньня друкуем пастанову бюро ЦК КП(б)Б. Партыйныя арганізацыі павінны зараз-жа, на-ходу выправіць свае памылкі, перабудаваць работу з тым, каб пастанова ЦК была выкананa цалкам і ў тэрмін. Усякім кулацкім разважаньням аб нерэальнасьці плянаў павінен быць пакладзены канец. Усе сілы, усю энэргію на бальшавіцкае правядзеньне плянаў загатовак.

Бальшавіцкай няпрымірымасьцю, зьнішчаючы рвацкія, месьніцкія, апартуністычныя, антыпартыйныя, кулацкія тэндэнцыі, мабілізуючы шырокія масы калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў — поўнасьцю і ў тэрмін выканаць плян загатовак

Пастанова

ЦК КП(б)Б аб ходзе загатовак хлеба, бульбы, лёну, жывёлазагатовак і адгрузкі бульбы для пралетарскіх цэнтраў СССР

ЦК КП(б)Б адзначае, што выкананьне гадавых плянаў загатовак (па становішчы на 20-X-31 г. па хлебу—35,4 проц., лёнавалакна 1 проц., лёнанасеньні—27,2 проц., бульбе—20 проц. і жывёлазагатовак—7,7 проц. квартальнага пляну—зьяўляецца абсолютна нездавальняючым і тарма лчым ход выкананьня асноўных гаспадарча-палітычных задач, што стаяць перад КП(б)Б.

Асабліва недапусьцімым трэба лічыць яўнае адставаньне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі: гэта вызначаецца ў тым, што адносная вага калгасаў у загатоўленым хлебе (на 16-X) складае толькі 28,7 проц. і саўгасаў 0,5 проц.

ЦК лічыць, што такое нездавальняючае становішча з загатоўкамі пры поўнай рэальнасьці і магчымасьці выкананьня намечаных плянаў у скарочаныя тэрміны, можна тлумачыць наступнымі асноўнымі прычынамі:

1) Дырэктывы ЦК аб разгортваньні загатовак і ў прыватнасьці—пастанова ЦК аб хлебазагатоўках (29 верасьня г.г.), якая абавязвала саўгасныя трэсты, Белкалгасцэнтр, Трактарацэнтр, хлебазагатоўчыя арганізацыі і райпартарганізацыі па бальшавіцку разгарнуць работу за выкананьне плянаў загатовак; дырэктыва, у якой ЦК патрабаваў рашучай барацьбы з кулацкай практыкай складаньня хлебафуражных балянсаў і барацьбы з размовамі аб нерэальнасьці плянаў загатовак, фактычна нявыканана.

2) Замест бальшавіцкай барацьбы за выкананьне плянаў загатовак энэргія шэрагу кіраўнікоў партыйных і савецкіх арганізацый была накіравана не на выкананьне плянаў загатовак, а на размовы аб нерэальнасьці і немагчымасьці іх выкананьня і на абарону неабходнасьці устанаўленьня праўменшаных плянаў, што прывяло да фактычнай барацьбы супроць плянаў.

Сярод шэрагу працаўнікоў і нават у ным ліку кіраўнікоў раённых партарганізацый існуюць анты-партыйныя настроі і стаўка на самацёк у загатоўках, якія (настроі) па сутнасьці выражаюць кулацкую лінію і зьяўляюцца вынікам неразуменьня новых форм клясавае барацьбы і тактыкі кулака, які імкнецца шляхам уплыву на найбольш адсталыя пласты колгаснікаў, распальваць спажывецкія настроі і тым самым разбураць колгасы знутры. Гэтыя спажывецкія і рвацкія настроі ў шэрагу калгасаў, стварэмыя клясавым ворагам, ня толькі не сустракалі рашучага і руйнуючага адпору, але падтрымліваліся асобнымі кіраўнікамі калгасаў і арганізацый. Гэтыя кіраўнікі па сутнасьці зьявіліся агентамі кулака ў партыйным, савецкім і калгасным апараце.

3) Шэраг раённых арганізацый і кіруючых калгасных органаў (уключаючы і Белкалгасцэнтр), устанавілі цьвёрдыя нормы збожжа і бульбы для кармоў, ня лічачыся з выкананьнем плянаў загатовак.

У шэрагу калгасаў стваралися хлебафуражныя балянсы, у якіх сьвядома праўвялічваліся патрэбы калгасаў, існавала і існуе стаўка на браніраваньне кармоў і харчоў у першую чаргу для колгасаў, а потым толькі здачы (продажы) рэшткаў дзяржаве, складаліся сьвядома неправільныя акты ўраджайнасьці з мэтаю меншай здачы лішкаў дзяржаве.

4) Белкалгасцэнтр сваімі кіруючымі ўказаньнямі на браніраваньне У ПЕРШУЮ ЧАРГУ хлеба-фуражных фондаў (бяз уліку выкананьня пляназагатовак) і ў практычным кіраўніцтве калгасная сыстэмай, не забясьпечыў правільнага правядзеньня партыйнай лініі ў галіне загатовак і фактычна салдзейнічаў распальваньню спажывецкіх настрояў у колгасах.

5) Белсельтрэст ня толькі ня выканаў выразна пастаўленых перад ім задач пастановаю ЦК ад 29 верасьня г. г., але сваімі яўна безадказнымі права - апартуністычнымі анты-партыйнымі адносінамі да загатовак і недапусьціма позьняй рассылкай плянаў загатовак (3 кастрычніка) фактычна сарваў загатоўкі саўгаснай сыстэмай ва ўстаноўленыя тэрміны. Гэта тым больш усугубляецца апартуністычнымі адносінамі шэрагу дырэктароў саўгасаў да выкананьня плянаў загатовак.

6) Партыкіраўніцтва Клічаўскага, Тураўскага, Любаньскага, Петрыкаўскага, Чавускага, Чашніцкага, Асіпавіцкага, Жыткавіцкага, Бягомльскага, Чэрвеньскага, Койданаўскага, Дрысенскага, Мазырскага, Плешчаніцкага, Рэчыцкага, Полацкага, Барысаўскага, Вушацкага, Брагінскага, Глускага, Лельчыцкага, Пухавіцкага, Заслаўскага, Чачэрскага, Ельскага, Лепельскага і Чэрыкаўскага раёнаў не арганізавала бальшавіцкай барацьбы за загатоўкі хлеба, бульбы, лёну, мяса і інш., і не дала рашучага адпору спажывецкім і рвацкім настроям і размовам аб нерэальнасьці плянаў.

7) У шэрагу раёнаў існуе неразуменьне той новай абстаноўкі загатовак гэтага году, якая стварылася ў выніку нашых посьпехаў у калектывізацыі сельскае гаспадаркі (50 проц.). Існуе недапушчальная недацэнка новых форм і неабходнасьці шырокага разгортваньня масавай работы вакол загатовак, побач з распаўсюджанай практыкай адміністраваньня ў загатоўках.

ЦК пастанаўляе:

1. Прапанаваць раённым партарганізацыям, саўгасным трэстам, Белкалгасцэнтру, Трактарацэнтру і загатоўчым арганізацыям разгарнуць самую актыўную работу вакол выкананьня плянаў загатовак, зараз-жа прыняць меры да выпраўленьня дапушчаных скажэньняў у загатоўках, спыніць усякія размовы аб нерэальнасьці плянаў у ўзяцца за іх сапраўды бальшавіцкае выкананьне.

Неабходна даць самы рашучы і бязьлітасны адпор рвацкім і спажывецкім настроям у шэрагу колгасаў, якія зьяўляюцца вынікам кулацкага ўплыву і стаўкай клясавага ворага на зрыў загатовак ў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

2. Указаць раённым партарганізацыям, Белкалгасцэнтру і Саўгастрэстам на тое, што на ўмацаваньне кармавой базы для разгортваньня жывёлагадоўлі павінны быць мабілізаваны ў першую чаргу ўсе ўнутраныя рэсурсы калгасаў і саўгасаў і браніроўка кармавых фондаў можа ўтварацца толькі зьвыш пляну загатовак і ні ў якім выпадку не за лік іх скарачэньня.

3. Абавязаць упаўнаважага Трактарацэнтру т. Каршакевіча і старшыню Калгасцэнтру т. Міцькова забясьпечыць масавую праверку колгасаў згодна дырэктыў Трактарацэнтру і Калгасцэнтру СССР з тым, каб выкрыць усе скажэньні ў галіне загатовак і дабіцца ў максымальна скарочаныя тэрміны выкананьня колгасамі абавязкаў перад дзяржавай У ПЕРШУЮ ЧАРГУ.

4. За права-апартуністычнае кіраўніцтва загатоўкамі і дапушчэньне кулацкага распараджэньня Райкалгассаюзу не здаваць бульбы па загатоўкам да сканчэньня складаньня кармавога балянсу, зьняць з работы з абвяшчэньнем суровай вымовы Сакратара Чавускага РК КП(б)Б т. Ільянка і старшыню РВК т. Сакалова.

5. За права-опортуністычнае кіраўніцтва і адсутнасьць бальшавіцкай работы па выкананьні плянаў загатовак, зьняць з работы Сакратара Клічаўскага РК КП(б)Б т. Чапёлкіна, Тураўскага РК—т. Ляхава, і Асіпавіцкага—т. Цімкевіча.

Абвясьціць суровую вымову Сакратарам РК КП(б)Б: Любаньскага—т. Лагуценка, Петрыкаўскага—т. Новікаву, Бягомльскага—т. Клютко, Жыткавіцкага—т. Багданаву і Чашніцкага тав. Іўры (у прыватнасьці за позьняе разьмяркаваньне і спуск плянаў па лёне і жывёлазагатоўках).

Папярэдзіць Райкомы КП(б)Б і упаўнаважаных ЦК—Койданаўскага, Чэрвеньскага, Дрысенскага, Мазырскага, Плешчаніцкага, Рэчыцкага, Полацкага, Барысаўскага, Вушацкага, Брагінскага, Глускага, Лельчыцкага, Пухавіцкага, Заслаўскага, Чачэрскага, Ельскага, Лепельскага і Чэрыкаўскага раёнаў, што калі ў працягу бліжэйшай дэкады ня будзе ў гэтых раёнах дасягнуты рашучы пералом у загатоўках, ЦК ў адносінах партыкіраўніцтва гэтых раёнаў прыме самыя рашучыя меры.

Зьняць з работы дырэктара Вушацкай МТС т. Баранава за правапартуністычнае кіраўніцтва загатоўкамі, невыкананьне плянаў і адсутнасьць рашучай барацьбы з спажывецкімі настроямі ў колгасах і папярэдзіць дырэктароў астатніх МТС, што ў выпадку нестварэньня рашучага пералому ў загатоўках, дырэктары МТС будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

6) Прапанаваць Калгасцэнтру, Наркамзему, Саўгасцэнтру і упаўнаважанаму Трактарацэнтру адмяніць усе распараджэньні і дырэктывы аб загатоўках, у якіх прадугледжана стварэньне ў колгасах і саўгасах збожжавых фондаў за лік устаноўленага пляну загатовак.

Прыняць да ведама заяву старшыні Белкалгасцэнтру т. Міцькова аб выпраўленьні няправільных дырэктыў па загатоўках і аб тым, што Белкалгасцэнтрам за зрыў плянаў загатовак і апартуністычныя адносіны да гэтае справы распушчаны Праўленьне Асіпавіцкага Райкалгасаюзу зьняты з працы старшыня Кармянскага Райкалгассаюзу т. Каршуноў, Клічаўскага—т. Берг і Чачэрскага т. Каган і абвешчаны вымовы старшыня Лагойскага Райколгассаюзу т. Вараб'ёву, Гарадокскага—т. Мельнікаву і Чашніцкага т. Юшкоўскаму. Справы аб зьнятых старшынях Райколгассаюзаў перадаць на разгляд ЦКК.

7. ЦК адзначае, што Белсельтрэст на працягу двух месяцаў не давёў пляну хлебазагатовак да саўгасаў сваёй сыстэмы. Тав. Грэбэнчык—дырэктар Белсельтрэсту, ня выканаў пастановы Бюро ЦК ад 29 верасьня і сваімі антыпартыйнымі адносінамі да загатовак сыграў на руку клясаваму ворагу. Зьняць т. Грэбенчыка з работы дырэктара Белсельтрэста з абвяшчэньнем суровай вымовы.

8. ЦК адзначае, што бульбазагатоўкі ідуць надзвычайна павольным тэмпам і таму не пакрываюць патрэбы вывазу. Прапанаваць парт арганізацыям і загатоўчаму апарату фарсіраваць бульбазагатоўкі, улічваючы неабходнасьць поўнага забясьпячэньня вывазу.

Пераключыць усе раёны па вывазе бульбы для Ленінграда, спыніўшы ўсялякія перавозкі бульбы на чыгунцы для мясцовых патрэб з тым, каб поўнасьцю выканаць плян вывазу не пазьней як да 1 лістапада гг.

9. Адзначыць зусім недапусьцімую расхлябанасьць у пастаноўцы вучоту загатовак у прыватнасьці, існаваньне абязьлічкі ў вучоце здаваемага хлеба і залічваньне здаваемай прадукцыі калгаснікамі, як здачу індывідуальным сэктарам сельскай гаспадаркі,—прапанаваць Белкаапсаюзу, пад адказнасьць т. Хаскіна, Наркомснабу пад адказнасьць т. Балціна Белхлебжывёлсаюзу пад адказнасьць т. Журомскага, Беллёнасаюзу пад адказнасьць т. Вішнеўскага і Белсадсаюзу пад адказнасьць т. Панамарова устанавіць дасканальны вучот загатовак, у прыватнасьці, вучот здаваемай продукцыі ў сэктарыяльным разрэзе, асабліва па сыстэме Белкаапсаюзу.

11. Прапанаваць усім РК недакладна разгарнуць рашучую барацьбу супроць недаацэнкі аднаасобнага сэктару ў выкананьні плянаў загатовак, супроць падмены масавай работы адміністраваньнем, за разгортваньне шырокай масавай работы і сапраўдную арганізацыю калгаснікаў беднаты і сераднякоў-адзінаасобнікаў на бальшавіцкую барацьбу за выкананьне загатовак гэтага году ў скарочаныя тэрміны раўняючыся на лепшыя раёны (Крычаў, Гомель, Сураж, Нароўля, Горкі).

12. Прапанаваць Белкалгасцэнтру і Агітмасаваму Аддзелу ЦК сумесна з газэтамі «Зьвязда» і «Калгаснік Беларусі» арганізаваць перадавыя ў загатоўках колгасы, прэміраваць ужо зараз перадавыя раёны і колгасы, якія выканалі і набліжаюцца да выкананьня пляну загатовак, склікаць іх зьлёты—узяўшы на буксір адстаючыя колгасы і раёны—разгарнуўшы шырокую масавую работу па мабілізацыі адстаючых на выкананьне пляну, рашуча змагаючыся з практыкай адміністраваньня ў загатоўках.

13. Пацьвердзіць неадпаразовыя дырэктывы ЦК аб спагнаньні загатовак у кулацка-заможных гаспадарках па цьвёрдых заданьнях. Прапанаваць усім РК КП(б)Б неадкладна выканаць тэлеграфную дырэктыву ЦК па гэтым пытаньні ад 21-X—31 г.

Аршаншчына павінна ліквідаваць самацёк у збожжазагатоўках

Неадкладна спагнаць з кулакоў цьвёрдыя заданьні

Збожжазагатоўкі ў большасьці сельсаветаў Аршаншчыны праходзяць самацёкам. Плян збожжазагатовак па Аршанскім раёне выкананы на 20 кастрычніка ўсяго толькі на 40 проц. З боку сельсаветаў, сельпо і асобных партыйных ячэек няма належнага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, якім даны цьвёрдыя заданьні.

Значна адстаюць калгасы, якія замест таго, каб быць перадавымі, адыгрываць вядучую ролю ў збожжазагатоўках, цягнуцца ў хвосьце. Плян збожжазагатовак, на 20-X па калгасным сэктары выкананы толькі на 25,3 проц., у той час як па аднаасобным сэктары—на 61,1 проц.

Збожжазагатоўкі ў большасьці сельсаветаў пасоўваюцца ўперад толькі тады, калі туды выяжджаюць брыгадэры з раёну.

Гэта значыць, што самі сельсаветы і сельспажыўтаварыствы збожжа загатоўкамі мала цікавяцца і не мабілізуюць на выкананьне плянаў калгасныя і бяднацка-сераднацкія масы. Многія сельсаветы ў збожжазагатоўках па калгасным сэктары спадзяюцца на самацёк, лічачы што калгасы, самі выканаюць пляны здачы лішкаў збожжавай прадукцыі і аб гэтым можна не клапаціцца.

Некаторыя сельсаветы наогул ня цікавяцца становішчам калгасаў, не займаюцца арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем іх, у выніку чаго калгасы цягнуцца ў абозе збожжазагатовак. Толькі адсутнасьць зацікаўленасьці з боку сельсаветаў калгасным будаўніцтвам, можна тлумачыць тое, што калгасы Багушэўскага сельсавету плян збожжазагатовак выканалі на 2,9 проц.

У той час, як некаторыя сельсаветы ў выніку ўдарнай работы дабіліся ўжо выкананьня кастрычнікаўскага заданьня ,рад сельсаветаў ,як напрыклад Зубаўскі, Дубраўскі, Астапенскі, Туміньніцкі, Багушэўскі, Баранскі і іншыя ганебна адстаюць і выканалі пляны збожжазагатовак ад 11 да 29 проц. Прычына іх адставаньня—самацёк, адсутнасьць масавай работы і слабы ўдзел у збожжазагатоўках партыйных ячэек.

Прыкладам гэтаму можа служыць Баранскі сельсавет, дзе ёсьць моцная партыйная ячэйка цьвіковага заводу «Чырвоны Кастрычнік», але яна мала цікавіцца збожжазагатоўкамі, і ў выніку Баранскі сельсавет выканаў пляны збожжазагатовак усяго на 28,1 проц. Мёж тым, пры адпаведным удзеле партыйнай ячэйкі і прафсаюзнай арганізацыі заводу, Баранскі сельсавет ужо даўно мог-бы выканаць пляны збожжазагатовак.

Паводле дырэктыў партыі і ўраду кулацка-заможныя гаспадаркі даўно павінны ўжо цалкам выканаць даныя ім цьвёрдыя заданьні па збожжазагатоўках. Аднак на 20 кастрычніка збожжазагатоўкі па цьвёрдых заданьнях выкананы па Аршаншчыне ўсяго на 17,5 проц.

Адсталасьць у гэтай справе тлумачыцца толькі тым, што значная частка сельсаветаў, сельспажыўтаварыстваў і партыйных ячэек Аршаншчыны адносяцца прымірэнча да кулака і заможніка і ня прымаюць ніякіх мер да таго, каб прымусіць яго ў тэрмін выканаць цьвёрдыя заданьні па збожжазагатоўках. Кантроль калгаснікаў і беднаты над выкананьнем кулакамі цьвёрдых заданьняў не арганізаваны.

У Клюкаўскім сельсавеце выкананьне цьвёрдых заданьняў літаральна ідзе самацёкам .Замест націску на кулака і заможніка, асобныя члены сельсавету абараняюць кулакоў і заможнікаў і імкнуцца вызваліць іх ад цьвёрдых заданьняў. Кулацка-заможная частка карыстаецца гэтым і заданьні ня выконвае.

Ня лепш абстаіць справа і ў Панізоўскім сельсавеце. Панізоўскі сельсавет загадаў каб кулакі і заможнікі здаўпны хлеб з квоткамі здачы зьяўляліся ў сельсавет для адзнакі. Зразумела, што кулакі і заможнікі ў сельсавет не зьяўляюцца, а таксама і ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. Плян спагнаньня цьвёрдых заданьняў па Панізоўскім сельсавеце выкананы ўсяго толькі на 3 проц.

Цэлы рад сельсаветаў—Багушэўскі, Межаўскі, Шапкаўскі, Высоцкі, Гальцаўскі, Дубраўскі, Пішчалаўскі і Яромкаўскі з кулацка-заможных гаспадарак цьвёрдыя заданьні зусім не спагняюць.

Раённыя і сельскія арганізацыі Аршаншчыны павінны неадкладна мабілізаваць усе свае сілы на ліквідацыю гэтых прэрываў у збожжазагатоўках з тым, каб на працягу застаўшыхся апошніх дзён кастрычніка поўнасьцю выканаць збожжазагатоўчыя плыны.

А. Сёмкін.

Плян адгрузкі бульбы зрываецца

Крывая штодзённай адгрузкі ідзе ўніз

Пракуратура рэспублікі павінна неадкладна ўжыць рашучыя захады да зрываючых забесьпячэньне ленінградзкага пралетарыяту

Штодзённае заданьне па адгрузцы бульбы 8000 тон



Плян адгрузкі за межы БССР выкананы на 57,9 проц.

Усе без выключэньня загатоўчыя арганізацыі здалі тэмпы адгрузкі.

Белкаапсаюз адгрузіў 1191 тону, Белплодагародніна — 701 тону, Белхлебжывёлсаюз—563 тоны, Белільнасаюз—280 тон, а Белсадсаюз зусім спыніў адгрузку. Па Белсадсаюзе плян адгрузкі ганебна зрываецца.

Усім загатоўчым арганізацыям, патрэбна зараз-жа па бальшавіцку па баявому ўзьняць тэмпы адгрузкі.

Да 1 лістапада засталося 6 дзён, якія вырашаюць выкананьне пляну.

Белсадсаюз павінен прыняць тэрміновыя захады да выкананьня пляну.

Масавы суботнік па ўборцы бульбы

Крычаў. 21-X. (Белта). 147 рабочых торфазаводу **«Калектыўная праца»**, дзень адпачынку скарысталі на ўборку бульбы ў калгасах. Па двух калгасах Міхееўскага сельсавету ўбрана рабочымі звыш 10 га бульбы. Рыхтуецца яшчэ адзін такі масавы суботнік.

Калгас імя Леніна заданьне па адгрузцы бульбы перавыканаў

Ельск. 20-X. (Белта). Калгас імя Леніна, Санюкоўскага сельсавету, скончыў уборку бульбы і гароднины, перавыканаўшы заданьне па здачы бульбы дзяржаве на 60 проц. Перавыкананa заданьне таксама і па здачы гароднины.

Патрэбны рашучы зрух

Бешанковічы, 20-X. (наш спэц. кар.) Уборка бульбы па раёне да гэтага часу ня окончана. Грамадзкасьць вакол гэтай кампаніі не мабілізавана. У калгасе «Бальшавік» Вярхоўскага сельсавету няўбрана яшчэ 30 га бульбы, але для фарсаваньня тэмпаў уборкі ні партячэйка, ні сельсавет ня прымаюць ніякіх мер. Амаль гэтак абстаіць справа і ў калгасах Асьвейскага ды Стрэлішчанскага сельсаветаў.

У раёне няма зьвестак аб выкананьні цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі.

Мельнікаў.

У Слуцку дарэм на прастойваюць вагоны

Слуцак, 24-X. (па тэлефоне ад нашага кар.). Тэмпы адгрузкі бульбы Ленінграду за апошні час Слуцкія загатоўчыя арганізацыі значна паслабілі. Замест 40 вагонаў у дзень ст. Слуцак адгружае 7-8 вагонаў. Замест надахвату вагонаў, які наглядаўся раней, цяпер шмат вагонаў стаяць лішнімі.

Дрэнна абстаіць справа з адгрузкай бульбы па калгасным сыстэме. Райкалгассаюз злачынна бязьдзейнічае і не арганізоўвае грамадзкай думкі калгаснікаў на хутчэйшае выкананьне плянаў уборкі і адгрузкі бульбы.

Райснаб не аказвае сталага апэрацыйнага кіраўніцтва і дапамогі загатоўчым арганізацыям і сельсаветам, а займаецца толькі складаньнем водак і пісаньнем пракурору паперак аб прыняцьці мер узьдзейнічаньня да адстаючых.

Перашкодай да выкананьня плянаў адгрузкі зьяўляецца зусім нездавальняючае правядзеньне бульбаўборкі, якая яшчэ ня скончана. Райвыканкомам не аддаецца тэтаму належнай увагі і ня прымае ніякіх мер узьдзейнічаньня да тых сельсаветаў, дзе ўборка бульбы злачынна зацягваецца.

Асабліва дрэнна ідзе выкананьне пляну адгрузкі бульбы кулацка-заможнымі гаспадаркамі, да якіх даведзены цьвёрдыя заданьні. Кулацка-заможныя гаспадаркі **Шысьціцкага, Палікарпаўскага, Ісернскага** сельсаветаў выканалі, напрыклад, цьвёрдыя заданьні па здачы бульбы толькі на 6 проц.

Трэба прыняць тэрміновыя і рашучыя меры да ўзмацненьня работы па адгрузцы бульбы Слуцкімі загатоўчымі арганізацыямі. Вінаватыя ў затрымцы і дарэмных перагонках прысланых для адгрузкі бульбы вагонаў, павінны панесьці адказнасьць.

А. Курдо.

ЗВОДКА

аб ход е збожжа загатовак па БССР на 21 кастрычніка

Назва раёнаў	Процант выкананьня
По сыстэме Белкаапсаюзу	
Аршанскі	48,4
Асьвейскі	89,0
Бабруйскі	51,1
Бешанковіцкі	44,8
Віцебскі	45,6
Вушацкі	42,9
Гарадокскі	40,0
Горацкі	62,7
Гомельскі	108,0
Дрысенскі	—
Дубровенскі	58,1
Крупскі	25,5
Лёзьнянскі	37,0
Лепельскі	29,3
Менскі	30,8
Магілеўскі	37,2
Мсьціслаўскі	31,0
Полацкі	43,7
Расьнянскі	47,0
Сеньненскі	55,0
Сіроцінскі	50,2
Сураскі	80,3
Талачынскі	57,0
Чавускі	27,2
Чашніцкі	26,0
Шклоўскі	57,8

Назва раёнаў	Процант выкананьня
По сыстэме Белхлебжывёлсаюзу	
Асіпавіцкі	12,3
Барысаўскі	34,5
Брагінскі	32,4
Буда-Кашалёўскі	34,4
Быхаўскі	43,5
Бягомльскі	14,9
Бялынецкі	46,9
Бярэзінскі	39,0
Веткаўскі	43,1
Глускі	27,1
Жлобінскі	42,6
Жыткавіцкі	31,5
Заслаўскі	34,3
Камарынскі	25,1
Кармянскі	37,1
Каралін кі	29,3
Касьцюковіцкі	42,5
Клімавіцкі	34,8
Клічаўскі	13,5
Койданаўскі	20,1
Капыльск	31,7
Краснапольскі	42,7
Крычаўскі	40,1
Лагойскі	41,0
Лельчыцкі	20,4
Лоеўскі	41,9
Любаньскі	21,9
Мазырскі	29,2
Нараўлянскі	62,4
Парыцкі	48,9
Плешчаніцкі	36,1
Прапойскі	28,3
Пухавіцкі	24,2
Петрыкаўскі	16,2
Рагачэўскі	30,2
Рэчыцкі	28,7
Слуцкі	22,4
Смалявіцкі	38,8
Стара-Дарожскі	11,7
Старобінскі	32,3
Тураўскі	10,7
Уваравіцкі	63,7
Узьдзенскі	28,2
Хойніцкі	40,9
Церахаўскі	51,3
Чачэрскі	32,4
Чырв. Слабод.	32,8
Чэрвеньскі	16,6
Чэрыкаўскі	32,0

Усяго па сыстэме Белкаапсаюзу гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 44,9 процэнтаў.

Усяго па сыстэме Белхлебжывёлсаюзу гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 32,5 проц

Усяго па БССР гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 36,6 проц.

Раўняйцеся па калгасу імя газэты „Віцебскі Пралетары"

Віцебск, 23-X. (Белта). Гадавы плян збожжазагатовак раён выканаў толькі на 31,9 проц. Партыйныя арганізацыі

„СПРАВЯДЛІВЫ“ ПЕРАДЗЕЛ КІТАЮ—ПРАГРАМА РАБОТ ЛІГІ НАЦЫЙ

Ліга Нацый „шукае формулу ўрэгуляваньня японска-кітайскага канфлікту, якая-б увянчала добрую волю абодвых бакоў“..

ЖЭНЕВА. 22-га ўвечары адбылося адкрытае паседжаньне рады Лігі Нацый па японска-кітайскаму канфлікту.

У пачатку паседжаньня Іосізава заявіў, што хоць ён па юрыдычных меркаваньнях і пярэчыў і працягвае пярэчыць супроць запрашэньня Злучаных Штатаў, аднак зараз, калі прадстаўнік ПАЗШ прысутнічае на паседжаньні, ён шчасьлівы яго вітаць і заверыць у традыцыйнай прыязьні Японіі і ПАЗШ. У адказ на заяву Іосізава Джыльбэрт заявіў, што ён ніколі і ня думаў, што пазіцыя японскага делегата дыктавалася іншымі меркаваньнямі, апроч юрыдычных.

Пасьля гэтага выступіў Брыян. Брыян зазначыў, што рада ніводнай хвіліны пя бязьдзейнічала ў японска-кітайскім канфлікце. Яна вяла ўвесь час перамовы з абодвымі бакамі і канстатавала, што абодвы бакі не абвастрылі канфлікту. У радзе ўвесь час шукалі фармулу, прыймальную для абодвых бакоў, якая была-б здольна «увянчаць іх добрую волю». Брыян агалашае праект рэзалюцыі. Рэзалюцыя напамінае абавязацельствы Японіі «магчыма хутчэй» вывесьці свае войска, па меры забесьпячэньня безапаснасьці японскіх грамадзян». Рада прапануе Нанкінскаму ўраду прыняць усе меры для забесьпячэньня безапаснасьці японскіх грамадзян.

Па сканчэньні эвакуацыі абодвым баком прапануецца прыступіць да непасрэдных перагавораў па ўсіх нявырашаных пытаньнях.

Пасьля агалашэньня праекту, з рэзалюцыяй выступіў Шы і зазначыў, што хоць праект і ня зусім адзе пасустрэч справядлівым чаканьням нанкінскага ўраду, аднак ён заслугоўвае вялізарнейшай увагі. Шы просіць кароткае адтэрмінаваньне для атрыманьня інструкцый ад нанкінскага ўраду.

Іосізава зазначыў, што Кітай парушыў інтарэсы японцаў на Паўднёва-Манчжурскай чыгунцы і падкрэсьліў, што неабходна папярэдняя згода па некалькіх «асноўных пунктах». Іосізава ўпамянуў, што ў 1927 г. зацікаўленыя дзяржавы згрупавалі ў Шанхаі 25 тыс. войска для абароны 30 тыс. чужаземцаў гораду. Японія-ж павінна абараняць 1½ мільёна японскіх грамадзян і мільярд долараў капіталу ў Манчжурыі. Ня гледзячы на гэта, Японія мае цяпер у Манчжурыі толькі 15 тыс. салдат. Іосізава падкрэсьліў, што немагчыма фіксаваць дакладную дату адводу японскага войска. У заключэньне Іосізава сказаў, што на конт прапанаванай рэзалюцыі ён выкажыцца пасьля паглыбленага яе вывучэньня. Пасьля гэтай прапановы паседжаньне пераносіцца на заўтра.

Японскі ўрад катэгарычна адмаўляецца ад эвакуацыі

ТОКІЁ. 23-X. Рада міністраў, азнаёміўшыся з рэзалюцыяй Лігі Нацый, якая патрабуе эвакуацыі да 16 лістапада, пастанавіла не адступаць ад прынятай палітыкі ў манчжурскім пытаньні і не адводзіць войска без забесьпячэньня безапаснасьці Паўднёва-Манчжурскай чыгункі і жыцьця японцаў.

Камэнтуючы рашэньні рады міністраў, прадстаўнік міністэрства замежных спраў заявіў: «Японскі ўрад ні ў якім разе ня прыме прапановы Лігі Нацый».

Жэнеўскія разгаворы і факты

Замест эвакуацыі—Японія пасылае новыя вайсковыя сілы ў Кітай

ТОКІЁ. 23-X. Вайсковае міністэрства Японіі, улічваючы рашэньне рады міністраў не павялічваць колькасьці войска ў Манчжурыі, парашыла з мэтаю ўзьняцьця баяздольнасьці часьцей забясьпечыць войска ў Манчжурыі дадатковым узбраеньнем па апошнім слове ваеннай тэхнікі, паслаўшы ў два разы большую колькасьць супроць звычайнай колькасьці кулямётаў, малакалібарных скорастрэльных гармат і г. д.

ТОКІЁ. 22-X. «Сімбу Рэнго» паведамляе, што вайсковая ўлада прыступіла да адпраўкі яшчэ адной дывізіі.

ТОКІЁ. 23-X. Паводле паведамленьня квантунскай арміі, японскія самалёты ўчынілі ваенныя апэрацыі супроць войска Ма.

Японскае камандваньне апраўдвае гэтыя апэрацыі тым, што войска Ма праяўляюць варожасьць ў адносінах самалётаў, ведаючы, што самалёты належаць Японіі.

Супроць баярскага ярма

Паўстаньне сялянскай беднаты ў вёсцы Кірсова

ВЕНА. 13-X. Паводле паведамленьня «Бесарабскага слова», у пачатку кастрычніка ў бесарабскай вёсцы Кірсава адбылося паўстаньне сялянскай беднаты.

Сяляне напалі на будынак падатковага ведамства. Былі выкліканы жандары, якія абстрэльвалі сялян. Арыштавана 8 сялян. «Бесарабскае слова» паведамляе, што сяляне ў многіх вёсках катэгарычна адмаўляюцца ад уплаты падаткаў.

ВЕНА. 17-X. Паводле паведамленьня з Бухарэсту, за апошнія два месяцы там адбыўся рад працэсаў супроць рэвалюцыйных рабочых.

ВЕНА. 17-X. Паводле паведамленьня з Белграду, учора ў Загрэбе паліцыя абшукала дом, у якім кавауся ўжо даўно шукаемы камуніст Йосіф Дэбэльяк, які, нібыта, нелегальна прыбыў ў Юга-Славію. Паліцыя пачала агонь. У перастрэлцы Дэбэльяк быў забіты.

Баявыя дэманстрацыі беспрацоўных у Аўстрыі

ВЕНА. 23-X. Ва ўсёй Аўстрыі адбыліся, наперакор забароне паліцыі, арганізаваныя кампартыяй вялікія дэманстрацыі беспрацоўных. У рабочых раёнах Вены дэманстравала некалькі тысяч беспрацоўных.

Дэманстрацыі скончыліся сутычкай з паліцыяй. Арыштавана 27 дэманстрантаў.

У Уграцэ (галоўны горад Штырыі) дэманстравала разам некалькі сот камуністаў. У прамысловым цэнтры Штырыі, у Брукэ на Муры, паліцыя штыхамі разагнала некалькі сот сабраўшыхся пад лёзунгамі кампартыі дэманстрантаў.

Мільёны прыгнечаных калёній уздымаюцца на барацьбу з імпэрыялістамі—рабаўласьнікамі

Паўстаньне на высьпе Кіпр

ЛЕНДАН. У Нікозіі—галоўным горадзе выспы Кіпра адбыліся буйныя непарадкі. Натоўпы дэманстрантаў сабраліся ля будынку ўраду, дзе адбылася сутычка з паліцыяй. Дэманстранты пусьцілі ў ход каменьні і дубінкі і падпалілі будынак ураду. Будынак згарэў цалкам.

Паліцыі спачатку не ўдавалася разагнаць натоўп, але пасьля быў адкрыты агонь і толькі тады дэманстрацыя была разагнана. Паранена 11 чалавек, забіты 1 чал. Непарадкі адбыліся на глебе нацыянальна-вызваленчага руху, які праходзіць на Кіпры пад лёзунгам аддзяленьня ад Англіі і аб'яднаньня з Грэцыяй. Ангельскі вярхоўны камісар зьвярнуўся да ўлады выспы Мальты з просьбай аб пасылцы ваенна-морскіх суднаў у падмацаваньне да агнельскага гарнізону выспы Кіпра.

Заўвага: Выспа Кіпр з 1878 г. знаходзіцца пад пратэктаратам Англіі. У пачатку сусьветнай вайны Англія цалкам анэксавала Кіпр, ператварыўшы яго ў сваю калёнію. Насельніцтва выспы складае 311 тысяч чалавек, з якіх каля 80 порц. грэкі.

Чарговы антысавецкі судовы фарс у Варшаве

ВАРШАВА. 23-X. У Варшаўскім апэляцыйным судзе ўчора пачалося слуханьнем справа Яна Палянскага, які быў прысуджаны да 10 год турэмнага зьняволеньня за замах на савецкае паўнамоцнае прадстаўніцтва ў Варшаве.

Італьянская забастоўка служачых магістрату Варшавы

ВАШАВА. 23-X. Італьянская забастоўка служачых магістрату ў Варшаве працягваецца.

У забастоўцы ўдзельнічаюць, паводле вестак газэт, каля 3.000 чалавек. Сац.-фашысцкія прафсаюзы робяць магчымыя намаганьні, каб перашкодзіць распаўсюджваньню забастоўкі на камунальных рабочых і як мага хутчэй ліквідаваць забастоўку служачых. Ня гледзячы на гэта, забастовачныя настроі сярод рабочых, асабліва сярод варшаўскіх трамвайшчыкаў, узмацняюцца.

У часе паседжаньня гарадзкога самакіраўніцтва некалькі сот беспрацоўных валадзілі бурную дэманстрацыю перад будынкам магістрату, патрабуючы хлеба і работы.

На капіталістычнае наступленьне—пралетарыят Польшчы адказвае чырвоным контр-наступленьнем

ВАРШАВА. 23-X. Канфлікт у лёдзінскай тэкстыльнай прамысловасьці абвастраецца.

Пад націскам мас прафсаюзы ППС «НПР» (нацыянальная партыя рабочых) і ХД (хрысьціянскія дэмакраты) парашылі склікаць дэлегацкі сход на 26 г. м. ва ўсіх фабрыках Лёдзінскага раёну для назначэньня забастовак на фабрыках, якія зрываюць калдагаворы.

У той-жа час абвастраецца становішча ў Верхняй Сілезіі. Прадпрыёцы працягваюць сваё наступленьне. Арбітражная камісія ў Касавіцах парашыла зьніліць заработак гандлёвым служачым на 5-10 проц. Адначасова мэталюргічнай і каменнавугальнай прамысловасьцяў прадпрыёмцы працягнулі рабочы дзень служачым і канторшчыкам на паўгадзіны.

Буйны завод сталёвай прамысловасьці «Гута Папоў» выдае рабочым і служачым толькі 50 проц. заработку.

Міжнародная хроніка

⊙ **Нямецкае пасольства пераслала** генэральнаму сакратару Лігі нацый дадатковыя даныя аб становішчы нямецкіх узбраеньняў.

Паводле гэтых даных, агульная сума нямецкіх вайсковых выдаткаў складае **707.722.623** маркі—з іх **520.728.000** марак складаюць выдаткі на сухадольныя ўзбраеньні і **187.000.000** марак—на расходы па морскім узбраеньні.

⊙ **У Фрыдляндзе** (усходняя Прусія) нацыянал-сацыялісты (фашысты) напалі на групу членаў арганізацыі рэйхсбаньэру. Адзін член рэйхсбаньэру забіты другі дзяжка паранены.

Партыйнае будаўніцтва

Шэсьць умоў тав. Сталіна—

у аснову ўсёй работы партыйных калектываў

Па прыкладу партыйнай арганізацыі заводу „Бальшавік“ забясьпечыць поўную рэалізацыю указаньняў правадыра партыі

Першачарговая адказьнейшая задача ўсіх парторганізацый

Поўнае ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна ёсьць першачарговая адказьнейшая задача ўсіх партыйных арганізацый, бо ад таго, наколькі хутка і поўнасьцю будуць ажыцьцёўлены гістарычныя паказаньні правадыра партыі тав. Сталіна, будзе залежаць выкананьне прамфінпляну ў вытворчасьці, будзе залежыць выкананьне ўсяго народна-гаспадарчага пляну.

Правядзімая зараз масавая праверка рэалізацыі гэтых умоў паказвае, што цэлы рад партыйных арганізацый правільна зразумелі вялікую важнасьць хутчэйшага ажыцьцяўленьня ўмоў, высунутых тав. Сталіным, і правільна зразумелі сваю ролю ў гэтым напрамку.

Друкуемы сёньня матар'ял заводу «Бальшавік» паказвае, што там, дзе партарганізацыі перабудавалі сваю работу па-новаму, на аснове практычнага ажыцьцяўленьня ўмоў тав. Сталіна,—там мы маем новы ўздым творчага энтузіязму рабочых мас, там мы маем новы прыліў рацыяналізатарскіх прапаноў, там прамфінплян выконваецца па ўсіх паказьніках.

Партыйны калектыў заводу «Бальшавік» паказвае лепшы прыклад таго, як трэба змагацца за практычнае ажыцьцяўленьне ўказаньняў правадыра партыі. Бюро партыйнага калектыву гэтага заводу здолела мабілізаваць усю партыйную арганізацыю, усіх рабочых і ўвесь адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал, здолела правільна расставіць партыйныя сілы, пабудаваць усю партыйную работу такім чынам, каб забясьпечыць выкананьне ўсіх тых задач, якія пастаўлены перад заводам.

Іменна на аснове ўкараненьня гаспадарчага разьліку ў цэхі і брыгады іменна на аснове палепшаньня культурна-бытавых умоў рабочых, іменна дзякуючы штодзённаму канкрэтнаму апэрацыйнаму кіраўніцтву работай па выкананьні прамфінпляну з боку бюро парткалектыву, таксама з боку цэхавых ячэек і груп парторгаў—завод «Бальшавік» пасьпяхова спраўляецца з сваімі задачамі.

Аднак, такое становішча мы маем далёка не ва ўсіх прадпрыемствах БССР. Рад прадпрыемстваў пакуль яшчэ ня ўключыўся ў двухдэкаднік праверкі.

Масавы агляд партыйнай работы, які павінен быць праведзены ў сувязі з перавыбарамі партыйных органаў, павінен выявіць як партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах і буйных саўгасах і калгасах перабудавалі сваю работу і, у першую чаргу, як партыйныя арганізацыі сталі на чаргу барацьбы за поўнае ажыцьцяўленьне 6-ці умоў тав. Сталіна.

Вопыт партыйнага калектыву заводу «Бальшавік» у гэтым напрамку павінен быць распаўсюджан на ўсе партыйныя арганізацыі.

Памножыць вопыт барацьбы за ажыцьцяўленьне 6-ці умоў тав. Сталіна

У абвешчаны двухдэкаднік праверкі рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна, Менскі чырвонасьцяжны завод «Бальшавік» уключыўся па ўдарнаму. Гэтае пытаньне было ўсебакова абгаворана на нарадах груп парторгаў, на адкрытых сходах партыйных груп, на дэпутацкай групе, на цэхавых гутарках і на бюро парткалектыву. У праверку выкананьня паказаньняў тав. Сталіна ўцягнуты ўвесь рабочы калектыў.

Дзякуючы праведзенай масавай рабоце калектыў заводу мае значныя посьпехі. **За час праверкі, дадаткова пераведзена на прагрэсыўна-прэм'яльную сыстэму тры брыгады. Дасягнуты значныя посьпехі ў галіне культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых, палепшылася работа па забесьпячэньні** (дровамі і гародніной) і па культурным абслугоўваньні, пашыраны дзіцячыя ясьлі.

За час праверкі паступіла новых 19 рацыяналізатарскіх прапаноў ад рабочых. 6 лепшых ударнікаў падалі заявы ў партыю. Падрыхтаваны да пераводу на гаспадарчы разьлік яшчэ 12 брыгад, а ўсяго на заводзе працуюць на гаспадарчым разьліку 24 брыгады.

Аднак праверка таксама выявіла рад буйных прарываў на паасобных вучастках работы. Так, з прычыны аслабленьня работы з рэзэрвова-дваразымі рабочымі, сярод апошніх назіраецца рост прагулаў. Калі ў III-м квартале мы мелі прагулаў сярод паказанай групы рабочых 0,42 проц., дык за першыя 10 дзён кастрычніка ўзрасьлі да 0,88 проц., што павялічвае агульную колькасьць прагулаў па заводзе.

Ёсьць асобныя выпадкі недабрасумленных адносін да машын з боку некаторых рабочых (Дзятко—Шароўная машына—2-гі хромавы цэх). З боку асобных майстраў назіраецца абыякія адносіны да правядзеньня зьменна-сустрэчных дзесяціхіліных вытворчыхнарад (майстар Фукс). Гэтыя ганебныя факты павінны быць неадкладна ліквідаваны.

У дні праверкі ўвесь калектыў рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу павінен быць мабілізаваны на барацьбу з гэтымі недахопамі. Задача партыйнай арганізацыі заводу заключаецца ў тым, каб яшчэ больш мабілізаваць усіх рабочых і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал на барацьбу за поўнае ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў правадыра партыі тав. Сталіна, што дасьць перамогу на Ўсесаюзным конкурсе на лепшае скурана-абутковае прадпрыемства.

Шамес Язэп.

Варашылаўцы могуць і павінны выканаць 6 умоў тав. Сталіна

Парткалектыў чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік» першым у Менску разгарнуў работу па аглядзе работы партгруп. На бюро парткалектыву, дзе абгаворвалася гэта пытаньне, даручана арганізатарскаму сэктару распрацаваць канкрэтны плян правядзеньня агляду, прыцягнуўшы да гэтай работы шырокія масы партыйнай арганізацыі з тым, каб лепшы вопыт работы партгруп перанесьці адстаючым.

Усяго на заводзе па ўсіх цэхох ёсьць 53 партгрупы. **Лепшыя прыклады работы падаюць партгрупы 2-га хромавага цэху, якому за выкананьне і перавыкананьне колькасных і якасных паказьнікаў прамфінпляну прысуджан пераходны сьцяг.**

Па гэтым цэху прамфінплян III-га кварталу па колькасных паказьніках выкананы на 102 проц., а па якасных на 114 проц. Сакрэт перамогі гэтага цэху заключаецца ў тым, што парторганізацыя заводу «Бальшавік» перабудаваўшы сваю работу, упарта змагаецца за поўнае ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна, што цэхавая ячэйка і партгрупы штодзённа апэрацыйна кіруюць барацьбой за прамфінплян.

Цэнтральным зьвяном, адказным за выкананьне прамфінпляну і іншых відаў работ у брыгадзе, зьяўляецца партгрупа. На заводзе, у цэху і брыгадзе правільна расстаўлены партыйныя сілы. Асабліва ўзорныя прыклады ў рабоце дапаюць партгрупы **брыгады рамшчыкаў, дзе группарторгам зьяўляецца член партыі ўдарнік тав. Гефэр і брыгады намазчыкаў на чале з группарторгам тав. Аляшкевічам.**

Кожная партгрупа гэтага цэху мае свайго агітатара, які зьвязан з агітакалектывам, які маецца пры партпрафгабінэце. На заводзе сыстэматычна праводзяцца штодзённыя дзесяціхвілінныя зьменна-сустрэчныя вытворчыя нарады ў брыгадах, якія даюць надзвычайна многа каштоўнага ў справе выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну і правільнай расстаноўкі рабочай сілы ў брыгадзе. Сакратары цэхавых ячэек праводзяць рэгулярна нарады груп парторгаў свайго цэху, дзе абменьваюцца вопытам і выпрацоўваюць канкрэтныя мерапрыемствы для далейшай работы. Бюро парткалектыву рабоце группарторгаў надае асаблівую ўвагу.

Такіх дасягненьняў у перабудове **партыйнай работы яшчэ не дамогся чырвонасьцяжны машына - будаўнічы завод імя Варашылава.** На гэтым заводзе, за выключэньнем парткгруп брыгад па зборцы правіясартовак і сьвідравальных варштатаў партгрупы да гэтага часу яшчэ не зьяўляюцца апэрацыйнымі штабамі барацьбы за выкананьне прамфінпляну.

Зараз партарганізацыя заводу імя Варашылава ўжо таксама разгортвае работу па аглядзе работы партгруп. 21-X бюро парткалектыву **правяло нараду** па гэтым пытаньні. Агляд работы партгруп на заводзе імя Варашылава павінен унесьці карэнны пералом у бок арганізацыйнага афармленьня партыйных груп пры кожнай брыгадзе, якія павінны зьявіцца **сапраўдным цэнтральным зьвяном** усёй партыйнай работы на заводзе, штабам апэрацыйнага кіраўніцтва барацьбой за прамфінплян.

Партарганізацыя заводу імя Варашылава па прыкладзе партарганізацыі «Бальшавіка» павінна мабілізаваць усе сілы на поўнае ажыцьцяўленьне паказаньняў тав. Сталіна.

З.

Хто за ядоцкае разьмеркаваньне даходаў—

ТОЙ ВОРАГ КАЛГАСУ

Кулак і яго агэнты імкнуцца прасунуць у калгас урэгулёўку, сарваць арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне, узарваць калгас знутры

Мацней удар па кулацкіх спробах разлажыць калгасную вытв рчасьць. Ні кроку ад прынцыпу—„хто больш і лепш працаваў, той больш і атрымлівае“

Разьмеркаваньне даходаў—пад штодзённы партыйны кантроль

Адным з асноўных зьвеньняў, якое садзейнічае арганізацыйна-гаспадарчаму замацаваньню калгасаў зьяўляецца правільнае разьмеркаваньне даходаў. «Разьмеркаваньне даходаў па працаднёх,—гаворыцца ў адозве ЦК КП(б)Б,—асноўнае зьвяно арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, за якое зараз трэба ўхапіцца. Толькі на аснове разьмеркаваньня даходаў па колькасьці і якасьці працы замацоўваецца зьдзельшчына, узьнімаецца прадукцыйнасьць працы, падвышаюцца якасныя паказьнікі калгаснай вытворчасьці».

Здавалася-б што гэтыя ўказаньні партыі павінны быць пакладзены ў аснову ўсёй барацьбы на фронце калгаснага будаўніцтва. Між тым, апошнія весткі НКЗему аб ходзе разьмеркаваньня даходаў у калгасе, матар'ялы рабселькораў сыгналізуюць аб яўнай недаацэнцы ў радзе месц пытаньня разьмеркаваньня даходаў у калгасе. Разьмеркаваньне даходаў знаходзіцца пад ударам самацёку. У радзе месц зямельна-калгасныя органы, партыйныя ячэйкі ня кіруюць разьмеркаваньнем даходаў. У выніку гэтага рад калгасаў пад уплывам кулацкай агітацыі яўна скаціўся да кулацкай ўраўнілаўкі, разьмяркоўваючы даходы з грубым парушэньнем працоўнага прынцыпу.

Аб чым сьведчаць зьмешчаныя ў сёньняшнім нумары нашай газэты факты аб ядоцкім разьмеркаваньні даходаў па калгасах Полацкага раёну? Гэтыя факты сьведчаць аб яўна-апартуністычнай недаацэнцы кіраўніцтва справай разьмеркаваньня даходаў з боку зямельна-калгасных органаў, партячэек і сельсаветаў. Замест барацьбы з кулацкай агітацыяй, кіруючыя органы калгаснай сыстэмы пакланяліся на самацёк.

Час пакончыць з апартуністычным самацёкам у справе разьмеркаваньня даходаў. Зямельна-калгасныя органы, партячэйкі павінны па-бальшавіцку пераключыцца на штодзённае кіраўніцтва арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньнем калгасаў.

Разьмеркаваньне даходаў у калгасах зьяўляецца аднэй з адказьнейшых работ, на якую павінны быць накіраваны ўсе сілы партыйных арганізацый. Спробы кулака сарваць разьмеркаваньне даходаў павінны атрымаць рашучы адпор, гэтыя спробы павінны быць разьбіты ўшчэнт.

Разьмеркаваньне даходаў у калгасах павінна быць узята пад штодзённы кантроль партячэек, пад строгі грамадзкі кантроль калгаснай масы.

Партячэйкі ня кіруюць справай разьмеркаваньня даходаў у калгасах

Асьвея. (Белта). З агульнага ліку 81 калгасаў раёну толькі у 24-х калгасах праведзены падлік даходаў і працадзён, але і гэта работа яшчэ не зацьверджана агульнымі сходамі калгаснікаў.

Дырэктыва Наркамзему аб папярэднім разьмеркаваньні ўраджаю ў калгасах да 15-га кастрычніка Асьвейскім раёнам ня выканана. Галоўная прычына зрыву разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасах тая, што партыйныя ячэйкі раёну яшчэ не павярнуліся тварам да калгаснай вытворчасьці, да арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў. Дагэтуль пануе апартуністычная чарговасьць кампаній. «Спачатку ліквідуем прарыў ў дарожным будаўніцтве, а потым пачнем падымаць зяб»,—гаворыць у Кісялеўскім сельсавеце, і ў выніку гэтага па сельсавеце ворыва пад зяб адно што пачалося.

Буйнейшы калгас «Колас Калініна» разьмеркаваў сенажаць па едакох, зараз з арганізацыяй у гэтым калгасе малочна-таварнай фэрмы не хапае кармоў. Таксама разьмеркавалі сенажаць па едакох калгасы імя Дзяржынскага і Шлях Леніна.

Партячэйкі не мабілізавалі ўвагі калгаснікаў на барацьбу з кулацкімі шрыцыцыямі разьмеркаваньня ўраджаю.

РК КП(б)Б павінен праверыць працу ячэек у тым напрамку, як яны павярнуліся тварам да арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў.

Не па едаках, а па колькасьці і якасьці працы разьмеркаваць калгасны даход

Полацак. (Наш. кар.). У Полацкім раёне маюць месца выпадкі разьмеркаваньня ўраджаю не па колькасьці і якасьці працы калгаснікаў, а па едакох. Напрыклад у калгасе «Золак», Сястронскага сельсавету, вызначана наступная паядоцкая норма разьмеркаваньня ўраджаю: даросламу калгаснику выдаецца на месяц 15 кілёграм жыта і 5 кілёграм мукі, дзецям ад 10—15 год, вызначана паўнормы дарослага.

Калгаснікі «Чырвонага Байца», Ліцьвінаўскага сельсавету разам з старшынёй сельсавету разьмеркавалі паміж сабою сена і канюшыну па 60—70 пудоў на карову і 20 пудоў на авечку.

Такія факты не адзінічныя ў разьмеркаваньні калгасных прыбыткаў і ўраджаю. Гэта яскрава таворыць аб тым, што райкалгасаюз, а таксама партыйныя ячэйкі не правялі належнай работы па папярэднім разьмеркаваньні ўраджаю і не абгаварвалі пастанову Наркамзему і Калгасцэнтру на шырокіх калгасных сходах, нарадах.

Нельга дапускаць кулацкай ураўнілаўкі ў разьмеркаваньні ўраджаю. Трэба неадкладна пакончыць з ураўнілаўкай з паядоцкай сыстэмай разьмеркаваньня ўраджаю. Партарганізацыі і сельсаветы павінны забясьпечыць правільнае разьмеркаваньне ўраджаю толькі па працаднёх і па якасьці працы.

Я Зорны.

Абагуліць таварна-прадукцыйную жывёлу

Разьмеркаваць калгасны ўраджай

Асіповічы. (Белта). Калгас «Расьсьвет» Замошанскага сельсавету за ўвесь час сваёй працы вельмі мала займаецца справай арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня. Калгас мае жывёлагадоўчы ўхіл, але і зараз таварна-прадукцыйная жывёла не абагулена.

Сельскі савет, і райкалгасаюз усім вельмі мала удзелялі ўвагі на дапамогу калгасам.

Разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў, як важнейшага сродку ў замацаваньні калгасаў, калгасамі не распачата.

Сельскаму савету і райкалгасаюзу разам з праўленьнем калгасу патрэбна безадкладна зьвінічыць гэтыя прарывы.

20 лепшых калгаснікаў-ударнікаў дэлегатаў зьлёту на дапамогу адстаючым калгасам

Бабруйск. (Наш. кар.). Скончыў сваю работу раённы зьлёт калгаснага і бядняцка-серадняцкага сялянства. Зьлёт, падводзіў вынікі гадовай працы калгасаў, абгаворваў пытаньне далейшага арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў. На зьлёце прысутнічала звыш 300 удзельнікаў, з іх значная частка беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў.

Зьлёт быў прысьвечаны дакладніку калектывізацыі і ўраджаю. Па дакладу аб сьвяце калектывізацыі і ўраджаю і задачах выкананьня гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі і ўраду зьлёт прыняў адозву ЦК КП(б)Б узяўшы на сябе рад канкрэтных абавязкаў.

Галоўнымі з іх адзначыў: на аснове арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў змагацца за далейшы калгасны прыліў, да 25 кастрычніка скончыць напярэдняе разьмеркаваньне ўраджаю ў калгасах, скончыць зяблеўвае ворыва, выканаць плян сіласаваньня, уборкі бульбы, разгарнуць бальшавіцкае змаганьне за выкананьне праграмы разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Зьлёт абавязаўся да 25 кастрычніка на 80 проц. скончыць загатоўку эбожжа з тым, каб да 14 гадавіны поўнасьцю выканаць плян, да гэтага-ж тэрміну скончыць загатоўку бульбы—здаць ня менш 50 проц. лёну.

Казуліцкі і Прадзьвінскі сельсаветы ў гонар зьлёту арганізавалі чырвоныя абозы з бульбаю і збожжам. На зьлёце рад беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў падалі заявы аб прыёме ў калгасы.

Зьлёт абвясьціў сябе ўдарным па выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў, для дапамогі адстаючым сельсаветам вылучыў 20 лепшых ударнікаў - удзельнікаў зьлёту.

А. Дамброўскі.

Краіна павінна ведаць сваіх герояў

Ударнікам сацыялістычнай будоўлі—ордэн працоўнага Чырвонага сьцягу

Уручэньне ордэнаў на пэрэзыдыуме ЦВК СССР

МАСКВА. На паседжаньні пэрэзыдыуму ЦВК СССР 23 кастрычніка адбылося ўручэньне ордэнаў савецкага Саюзу новай групе таварышоў.

Ордэны працоўнага Чырвонага сьцягу ўручаны наступным таварышом: памоцніку паравознага майстра дэпо станцыі Белгарад—тав. **Бабчанка**, памоцніку дырэктара дзяржаўнага пітомніка імя Пічурына—тав. **Гаршкову**, былому галоўнаму інжынэру «Волхоўстроя»—тав. **Графтыо**, заг. інструментальнай майстэрняй заводу ім. Буденнага—тав. **Крайнаву**, вадаправодчыку-параправодчыку заводу «Чырвоная вогранка—тав. **Лабанаву**, заг. чыстапракатным цэхам заводу «Серп і молат»—тав. **Монгеру**, рабочаму Матавілінскага заводу—тав. **Папову**, майстру чыгуна-ліцейнага цэху заводу ім. лейтэнанта Шмідта—тав. **Тэр-Царсегаву**, старэйшаму майстру жалезнапракатнага цэху заводу «Красное Сормово»—тав. **Трэцьякову**, дарожнаму майстры станцыі Ясінаватая—тав. **Шчаглову**, старэйшаму інспэктару крымскіх трактарных майстэрняў—тав. **Чарнагубаву**, рабочаму Высокагорскага жалезнага рудніка — тав. **Козьміну** і мэханіку Пятроўскай машына-трактарнай станцыі—тав. **Кашанкаву**.

Ордэны Леніна ўручаны нам. кіраўніка трэсту «Азнефть»—тав. **Агавэрдзіеву**, пам. цэхавага майстры заводу імя лейтэнанта Шмітда—тав. **Бакуры**ну, былому заг. шахтай «Волхово»—тав. **Касауравy** (з дадатковай грашовай узнагародаю ў 5.000 руб.), старэйшаму мацёру заводу «Флегматык»—тав. **Ленскаму**, асобаўпанаважанаму «Союзнефти»—тав. **Маміканьянцу** і майстры мартэнаўскага цэху Макееўскага мэталюргічнага заводу—тав. **Рэзьнікову**. Апроч таго, баявы ордэн Чырвонага сьцягу ўручаны б. паліт-работніку 3-й кавалерыйскай брыгады—тав. **Мажараву**.

На зьезьдзе

навуковых працаўнікоў БССР

У дзень 23 кастрычніка працягваліся спрэчкі па дакладу т. Горына. На вячэрнім пасяджэньні зьезд заслухаў заключнае слова т. Горына па дакладу аб задачах і далейшым разьвіцьці навуковай справы ў БССР.

Зьезд навуковых працаўнікоў віталі дэлегацыі ад тарфянога і мэдычнага інстытутаў.

На вячэрнім паседжаньні зьезд заслухаў даклад т. Платуна аб практычнай рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе.

24 кастрычніка на працягу ўсяго раньнішняга паседжаньня працягваліся спрэчкі па дакладу т. Платуна. У спрэчках па дакладу выказаліся каля 25 чалавек. На сваім вячэрнім паседжаньні зьезд заслухаў заключнае слова т. Платуна і разьбіўся па сэкцыях для работы.

Сёньня а 6 гадзіне ўвечары ў актавай зале БДУ адбудзецца заключнае ўрачыстае паседжаньне зьезду.

Друк - на перадавыя пазыцыі барацьбы

ЗА КАРЭННУЮ ПЕРАБУДОВУ РАБОТЫ САВЕТАЎ УКЛЮЧЭНЬНЕ ЛЕПШЫХ У „ЧЫРВОНУЮ КНІГУ"

„Ленінскі прызыў" і „Камунар Магілеўшчыны", прымайце выклік „Камуніста"

„Камуніст" выклікае на сацспаборніцтва „Ленінскі прызыў" і „Камунар Магілеўшчыны"

Менск. Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь"

(Па тэлефону з Бабруйску)

Рэдакцыя газэты «КАМУНІСТ» уключаецца ў сацспаборніцтва за стварэньне «ЧЫРВОНАЙ КНІГІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РАПАРТАЎ САВЕТАЎ» якая арганізуецца па ініцыятыве газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ».

На сваіх старонках газэта «Камуніст» арганізуе масавы мітынг—пераклічку саветаў раёну.

Мітынг-пераклічка пачынаецца з наступнага нумару.

«Камуніст» выклікае пасьледаваць свайму прыкладу газэты «Ленінскі прызыў» (Ворша) і «Камунар Магілеўшчыны».

Рэдактар газ. «Камуніст» ГРЫНГЛАЗ

На нарадзе сельсаветаў лёнаводных раёнаў

Віцебск. (Ад наш. спэцкора). 20 і 21 кастрычніка ў г. Віцебску адбылася нарада сельсаветаў 6-ці лёнаводчых раёнаў: **Віцебскага, Сеньненскага, Сроцінскага, Гарадокскага, Лёзьненскага і Бешанковіцкага,** скліканая ЦВК БССР па пытаньні аб перабудове мясцавай работы саветаў.

На нараду прыбылі старшыні РВК, сельсаветаў, члены некаторых сельсаветаў, прадстаўнікі Віцебскага, Горацкага саветаў і шэфствуючых над вёскай арганізацый. Асноўны і адзіны **даклад «аб перабудове работы саветаў у сувязі з чарговымі задачамі»,** зрабіў прадстаўнік ЦВК БССР тав. **Адамчук.** Дакладчык у выліку і грунтоўным дакладзе згрупаваў увагу нарады на чарговых задачах калгаснага будаўніцтва. Галоўнейшая задача на даным этапе—гэта арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў і разьвіцьцё калгаснага руху. Пры вызначэньні ролі сельсаветаў трэба выходзіць з агульнай устаноўкі на пасьпяховае завяршэньне народна-гаспадарчага плану трэцяга году пяцігодкі і наколькі сельсаветы наогул зрабіліся штабам сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Найлепшым прыкладам наколькі саветы перабудоўваюць сваю работу ў адпаведнасьці з узрослымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва—зьяўляецца пастаноўка масавай работы сельскіх саветаў.

— **Наша нарада,**—гаворыць дакладчык,—**склікана для таго, каб усе бакова абгаварыць пытаньне аб правільнай пабудове важнейшай работы савету—масавай. Неабходна раз і назаўсёды выбраць з вялікай колькасьці новых форм і мэтадаў работы, узьнікшых за апошнія часы, тое карыснае і станоўчае, што магло-б дапамагчы перабудове работы саветаў.** Сельсаветы за апошні час ужо не адыгрываюць ролі простых выканаўцаў дырэктыў. Роля саветаў значна ўзрасла. Сельсаветы, у прыватнасьці, зрабіліся зьвенямі сыстэмы саветаў, якія носяць на сябе цэлы рад новых абавязацельстваў і новых правоў.

Па дакладу тав. Адамчука разгарнуліся шырокія спрэчкі.

У сваіх справаздачных садакладах старшыні сельсаветаў інфармавалі нараду аб становішчы работы свайго сельскага савету, як па частцы масавай работы, так і па лініі выкананьня саветамі важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній апошняга часу. З паданых 25 справаздач неабходна заключыць, што масавая работа была найслабейшым вучасткам у работе саветаў. У тых сельсаветах дзе масавасьці ня было—правал у правядзеньні сяўбы, загатовак і мабілізацыі сродкаў. Там, дзе ня было масавасьці былі выпад кі скрыўленьня клясавай палітыкі, якое выявілася ў пераабкладаньні бедняка і серадняка і ў слабай барацьбе з кулацка-заможнымі часткамі вёскі. Большая частка выступаўшых адзначылі, што даўно насьпела неабходнасьць ва ўзмацненьні сэкцыі савету і стварэньні дэпутацкіх груп у калгасах, саўгасах і МТС.

Масавы агляд і справаздачная кампанія ўскалыхнулі актыўнасьць мас калгасьнікаў. Ёсьць рад выпадкаў, калі сяляне ўступалі ў калгасы у момант правядзеньня масавага агляду. **Выступаючыя адзначылі вялікую палітычную і арганізацыйную ролю газэты «Савецкая Беларусь» за час правядзеньня агляду саветаў і справаздачнай кампаніі.**

У спрэчках удзельнікі нарады выступалі па некалькі разоў. На ранішнім паседжаньні 21 кастрычніка выступіў прадстаўнік Віцебскага гарадзкога савету і шэфскіх таварыстваў фабрык і заводаў. З вялікай прамоваю выступіў таксама прадстаўнік рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь». Паводле прапановы ўдзельнікаў нарады, пасьля дэталёвага абгаворваньня звароту Мозырскай міжраённай нарады саветаў,—аднагалосна быў прыняты адказ: **Нарада пастанавіла зьвярнуцца да ўсіх лёнаводных раёнаў БССР з прапановай уключыцца ў сацыялістычнае спаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў БССР».**

З вялікім уздымам была прынята рэзалюцыя-тэлеграма аб уключэньні ўсіх сельсаветаў—удзельнікаў нарады ў **сацспаборніцтва за «Чырвоную кнігу».**

Нарада закончыла сваю работу 21 кастрычніка заключным словам дакладчыка тав. **Адамчука** і прыняцьцем рэзалюцыі.

На заключным паседжаньні пасланы прывітальная тэлеграма ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР.

Гарын З. Р.

Станькаўскі сельсавет скончыў папярэні масавы агляд

Работа па масавым аглядзе ў **Станькаўскім с-с,Сураскага р-ну** пачата з 8-X-31 г. і скончана 15-X-31 г.

Дырэктыва ЦВК БССР і прэзыдыуму РВК па частцы масавага агляду выкананa.

Арганізавана было 6 брыгад з колькасьцю 36 асоб, якія прыцягвалі да работы на месцах актыў з рабочых, батракоў і калгасьнікаў.

Агляд быў праведзены ва ўсіх арганізацыях і ўстановах, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельскага савету.

Сельскі савет у галіне калектывізацыі ў часе масавага агляду мае наступныя дасягненьні: на 1-I-31 г. было калектывізавана 7 проц., на 15-X-31 г.—45 проц.

Наогул масавы агляд работы савету выявіўся з работай па ліквідацыі недахопаў у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній.

У галіне загатовак.

зярнёвых культур—на 5-X-31 г. 32%
зярнёвых культур—на 15-X-31 г. 102%
бульбы . . . . —на 5-X-31 г. 3%
« —на 15-X-31 г. 24%.

Па лініі ўборкі бульбы і апрацоўкі лёну.

На 5-X—31 г. бульба амаль што ўся стаяла на полі:

на 15-X-31 г. 99,5 проц.

Уборка лёну—на 15-X-31 г. 100% уборка і расьліі лёну.

Усё гэта гаворыць за тое, што справа масавага агляду была накіравана на ліквідацыю маючыхся прарываў.

Калгасьнікі калгасу «Культура», ужываючы мэтад сацспаборніцтва і ўдарництва, на працягу дэкады ліквідавалі прарывы па частцы ўборкі бульбы, лёну, абмалоту, расьліе яго і прыступілі за час агляду да разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасах.

Усё гэта адбылося ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Кулак аказваў жорсткае супраціўленьне і зрываў мерапрыемствы правадзімыя партыяй і ўрадам.

Усе важнейшыя гаспадарча-палітычныя пытаньні папярэдня прапрацоўваліся на групе беднаты, якая арганізоўвалася на практычнае вырашэньне пастаўленых перад сельсаветам задач.

Сельсаветам наладжваліся выязныя прэзыдыумы і пленумы сельсавету ў калгасы і буйныя паселішчы, якія адбываліся пры шырокім удзеле працоўных мас.

Побач з гэтым агляд выявіў у працы савету шмат буйных недахопаў. Сэкцыі, як адна з важнейшых форм масавай работы, працу як след (за выключэньнем культурнай і фінансавай) не разгарнулі.

Папярэдняя прапрацоўка пытаньняў у сэкцыях не наладжана. Паасобныя з іх існуюць фармальна. Работа сярод жанчын стала не праводзілася. Апошняя праводзілася з кампаніі да кампаніі.

Актыў у работу сельсавету ўцягваўся недастаткова, а адсюль мелася недавыкананае плянаў.

Работа грамадзкіх арганізацый не разгорнута.

Маюцца таксама буйныя калгасы «Зьвязда», «Бязбожнік», у якіх зьдзельшчына ўведзена фармальна, абязьлічка не ліквідавана. Улік працадзён праводзіцца звыш нормы, адсюль запісана па калгасе каля 1000 лішніх дзён.

Усе гэтыя недахопы выяўлены ў часе агляду работы савету. Брыгадамі прыняты канкрэтныя меры да ліквідацыі недахопаў.

Кулацкія агенты члены савету **Міхай лоўскі** і інш., якія ня здольны праводзіць лінію партыі, змагацца за баль шавіцкія тэмпы работы, выведзены са складу савету.

Справаздачная кампанія зьявіцца сродкам для яшчэ большага ўмацаваньня сельсаветаў, як органу дыктатуры пралетарыяту і стымулам да разгортваньня масавай работы на падставе апошніх дырэктыў партыі і ўраду

Вяртошка.

Чаму Слуцкі гарсавет ня ўключыўся ў спаборніцтва за месца ў „Чырвонай кнізе"

Слуцак (наш. кар.). 23 кастрычніка ў Слуцку адбыўся пленум гарадзкога савету, на якім стаяла справаздача прэзыдыуму.

Са справаздачы відаць, што работы сэкцыі і дэпутацкіх груп на прадпрыемствах ніякай ня было, адсутнічала апэрацыйнае кіраўніцтва дэпутацкімі групамі, у выніку чаго апошнія зусім не працавалі. Не працавала і камунальная сэкцыя; не працуе фінансава-бюджэтная сэкцыя, у выніку чаго значныя прарывы ў выкананьні фінпляну. Зусім слаба працуе і культбытавая сэкцыя. Нічога ня зроблена ў забясьпечаньні школ апалам. Гарадзкія школы ня маюць ніводнага мэтра дроў і змушаны будуць закрыцца ў часе наступленьня халадоў. Прывозкай дроў ніхто не займаецца.

Справа ліквідацыі няпісьменнасьці па горадзе ў заняпадзе. Шмат няпісьменных не наведваюць арганізаваных пунктаў. Гарсавет да гэтага часу нічога ня ведаў аб сацспаборніцтве на заняцьце месца ў «Чырвонай кнізе». **На пленуме была ўнесена прапанова аб уключэньні Слуцкага гарсавету ў сацспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартаў саветаў», але па невядомых прычынах гэтая прапанова ў выпрацаванай рэзалюцыі ня ўключана.**

Гарсавет баіцца вызначаных у праграме ўмоў, не спадзяецца на свае сілы па ліквідацыі прарываў і недахопаў. Неабходна зараз-жа, у часе справаздачнай кампаніі, зрабіць рашучы пералом у рабоце гарадзкога савету.

Слуцак павінен уключыцца ў сацспаборніцтва.

Курдо.

Ліквідаваць адставаньні

Праверка работы Люааньскага **местачковага савету** паказала, што ён не перабудаваў сваёй работы, не павярнуўся тварам да калгаснага будаўніцтва. Па калектывізацыі мессавет стаіць на апошнім месцы па раёне. На 20-X-31 г. калектывізавана ўсяго 9 проц. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак. З 32 членаў савету ўсяго трое калгасьнікаў. Члены савету ня толькі не дапамагаюць калгасам, а наадварот, перашкаджаюць калгаснаму руху. На правядзімых сходах сялян, пленумах, нарадах, ні адзін член савету не гаворыць аб калектывізацыі. Толькі **тав. Лучыновіч,** які ня так даўно стаў старшынёй мессавету, па бальшавіцку змагаецца за ажыцьцяўленьне задач, якія стаяць перад саветам.

Наступленьне на рэшткі капіталістычных элемэнтаў па ўсім фронце не знайшло належнага адбітку ў рабоце мессавету. Члены савету не выкрываюць кулакоў. Усяго па сельсавеце выкрыт...—адзін кулак. Нагледаюцца выпадкі яўнага патураньня кулацтву з боку членаў савету.

У **Любаньскім** местачковым савеце арганізаваны адзін інтэрнацыянальны калгас «Ударнік». Калгас па колькасьці гаспадарак і па моцнасьці слабы. Кіраўніцтва з боку савету дрэннае. У калгас пралезьлі варожыя элемэнты, і там патрэбна неадкладна правесьці чыстку.

Дрэнна пастаўлена культмасавая работа. Сэкцыі пры мессавеце не працуюць. Дабраахвотныя арганізацыі працуюць слаба. Раённы «Дом Культуры», які знаходзіцца пад веданьнем м-савету, працуе дрэнна. Вакол яго не разгорнута палітасьветная работа. У мястэчку ёсьць каля 25 настаўнікаў, але яны ня ўсе ўцягнуты ў культасьветную работу.

Слаба разгорнута і работа з беднатой. Не сабраны страхавы фонд.

У выкананьні плянаў загатовак, мабілізацыі сродкаў, м-савет цягнецца ў хвасьце.

Культурная рэвалюцыя ў м-савеце не знайшла пэўнага адбітку. Ліквідацыя няпісьменнасьці яшчэ не пачата. Ліпункты не ўкамплектаваны і не працуюць. Дабрабыт мястэчка не пастаўлены на належную вышыню. Абвешчаны раней месячнік санітарыі і гігіены м-саветам амаль праваленны. Ваенізацыя насельніцтва адсутнічае.

Рэўкамісія пры м-савеце не працавала, не выяўляла адмоўных бакоў у рабоце савету.

Партыйнае кіраўніцтва работай м-савеце слабое. Партыйцаў і камсамольцаў у мястэчку шмат, але ўдзел у рабоце савету прымаюць адзінкі.

Профсаюз таксама дрэнна дапамагаў у рабоце м-савету.

Усе гэтыя прарывы, якія маюцца ў **Любаньскім** местачковым савеце могуць быць зьнішчаны толькі тады, калі склад м-савету будзе абноўлены, калі ў савет будуць абраны лепшыя ўдарнікі, калгасьнікі, беднякі і сераднякі адданыя рабоце, калі будзе ўзмоцнена партыйнае кіраўніцтва саветам.

Справаздачная кампанія павінна прайсьці пры разгорнутай бальшавіцкай крытыцы і самакрытыцы накіраванай на выяўленьне адмоўных бакоў работы савету, на карэнную перабудову яго работы.

„Левыя" загібы ў практычнай рабоце Горацкага сельсавету

У Горацкім сельсавеце Поладкага раёну ёсьць шмат выпадкаў скрыўленьня клясавай лініі ў рабоце сельсавету.

Работнікі гэтага сельсавету замест таго, каб шырока абгаварыць гэтыя факты скрыўленьня клясавай лініі на пленумах сельсавету і разьбіць увесь актыў на брыгады для правядзеньня масавай работы сярод бядняцка-серадняцкай часткі вёскі абмяжоўваецца канцылярска-бюракратычным кіраўніцтвам.

Дрэнная справа і з даведзеньнем цьвёрдых заданьняў да заможна-кулацкіх гаспадарак.

Калі падлічыць у процантных суадносінах да аднаасобнага сэктару, дык атрымаем, што 50 проц. аднаасобнікаў атрымалі цьвёрдыя заданьні. Старшыня сельсавету т. **Яцкевіч ня ведае** каму даводзяцца цьвёрдыя заданьні. Гэтай справай кіруе рахункавод **Касьпяровіч,** гаспадарка якога ў сучасны момант сама мае цьвёрдае заданьне па збожжазагатоўках.

Былі выпадкі, што ў гэтым годзе даводзілі цьвёрдыя заданьні сем'ям чырвонаармейцаў, як прыклад: Сьвірку **Максіму Захараву** з вёскі **Мураўі,** якое было зьнята толькі пасьля ўмяшаньня ў гэту справу каманднага складу той вайсковай часткі дзе сын т. Сьвіркі М. служыць.

Праходзячая ў сучасны момант справаздачная кампанія і папярэдні агляд саветаў, у якой павінен прыняць непасрэдны ўдзел Полацкі РВК, павінна ўскорыць і ачысьціць Гарадоцкі сельсавет ад кулацкай агентуры.

Полацкі РСІ зараз-жа павінна заціка віцца гэтай справай, кулацкія агенты Яцкевіч і Касьпяровіч павінны быць прыцягнуты да адказнасьці за ігнараваньне дырэктыў савецкай ўлады.

Барысёнак П.

Сьвята мэдычнай асьветы (Да 10-годзьдзя Беларускага Дзяржаўнага мэдінстытуту)

22 кастрычніка адбыўся ўрачысты вечар навуковых працаўнікоў і прафактыву мэдінстытуту, прысьвечаны 10 годзьдзю.

Вечар супаў з днём уходу дырэктара мэдычнага інстытуту праф. Кроля на іншую адказную навуковую працу. Прадстаўнікі партыйных і прафсаюзных арганізацый адзначылі вялікую ролю, якую адыграў праф. Кроль у справе стварэньня вышэйшай мэдычнай школы ў БССР.

Нарком аховы здароўя тав. Цэнцыпер у сваім уступным слове па пытаньні аб разгортваньні мэдычнай асьветы ў БССР падагуліў вынікі тэй вялікай і каштоўнай працы, якую правёў мэдычны інстытут на працягу мінулага 10 годзьдзя пад кіраўніцтвам праф. М. Б. Кроль.

Была адзначана і вялікая заслуга ў справе аховы здароўя ў прыватнасьці ў справе арганізацыі клінічнага гарадка Л. М. Каца. На працягу 7 год Кац працуе на розных пасадах у органах аховы здароўя. Ён зьяўляецца рабочым, бальшавіком, адданым той справе, якую яму даручыла партыя. Кац зьяўляецца арганізатарам клінічнага гарадка, аднэй з буйнейшых лекавых устаноў. Пад бурныя воплескі прынята было рашэньне аб арганізацыі «дошкі гонару» з занясеньнем на яе першага дырэктара клінічнага гарадка тав. Каца, які ў сучасны момант пераходзіць на іншую адказную работу па ахове здароўя працоўных мас.

На вечары была зачытана пастанова СНК БССР аб наданьні годнасьці заслужаных дзеячоў навукі прафэсарам Кролю і Гаўкману.

Ад імя СНК БССР былі ўручаны гаманароўя граматы прафэсарам Мелюх, Выдрыну, Рубашову, Сакалоўскаму, Пракапчуку, Корчыцу, Маршаку і Камінскаму.

Акрамя гэтага ад Нарком Аховы Здароя былі ўручаны граматы асыстэнту Лапоцька, асьпіранту Башкевіч, асьпіранту Бярыч, прафэсару Леонаву, нам. дырэктара мэд. інстытуту Кацу, Прафэсару Лебедкіну, Таўвер Вольцы,—працаўніцы інстытуту, праф Цітову. праф. Чарвакову, дацэнту Шапіра М. Н., дацэнту Сітэрман, Таўвер Язэпу—працаўніцу кафэдры судовай мэдыцыны, дацэнту Гінзбургу, дацэнту Мангейму, Кобяк,—працаўніцы інстытуту, дацэнту Глёдвэршук, дац. Мананзон, Пятровай—працаўніцы інстытуту, дац. Іргер,—праф. Ленцу, дац. Лаўшыц, Ліпаўску—працаўнік інстытуту, праф. Маўрадзідзэ, дац. Хазанаву і праф. Розанаву.

У ПАХОД ЗА ЭКАНОМІЮ ПАЛІВА І ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ

Зьнішчым недахоп у паліве

Узрост сацыялістычнай прамысловасьці ў 1931 годзе патрабуе ад нас поўнага выкананьня плану па забесьпячэньні паливам прадпрыемстваў, дзяржаўных і навучальных устаноў і грамадзянскага насельніцтва.

Між тым, значнае недавыкананьне як па дровазагатоўках і вывазцы, так і па здабычы торфу, выклікае значную пагрозу далейшаму разьвіцьцю нашай прамысловасьці і выкананьню пляну 4-й квадры. Між тым 4-я квадра павінна ў значнай колькасьці пакрыць той прарыў, які мы мелі на працягу трох квадраў 1931 г.

Баявая мабілізацыя партыйных, прамадзкіх і прафсаюзных арганізацый і асабліва інжынэрна - тэхнічных працаўнікоў на выкананьне і перавыкананьне пляну па дровазагатоўках і торфа-здабычы яшчэ не забясьпечыла пляну патрэбнасьці сацыялістычнай прамысловасьці ў паліве.

Стварыўшаяся становішча ў значнай ступені можа быць вытлумачана шляхам бальшавіцкай барацьбы за мабілізацыю унутраных рэсурсаў, за максымальную эканомію палива і электраэнэргіі. У гэтай працы інжынэрна - тэхнічныя працаўнікі павінны зьяўляцца першай шарэнгай на прадпрыемствах, якая павінна на падставе навейшых тэхнічных ведаў і практычнага вопыту павесьці шырокую барацьбу за максымальную эканомію палива і электраэнэргіі і тым самым зьнішчыць стварыўшыйся недахоп у паліве.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум Бел. МБІТ абвяшчае **масавы паход ІТР за эканомію паліва і электраэнэргіі** на працягу ўсяго астатняга часу 4 квадры — у адпаведнасьці з загадам ВСНГ СССР.

Для практычнага забясьпячэньня гэтага паходу, прэзыдыум БелМБІТ прапануе ўсім сэкцыям ІТР — ажыцьцявіць наступнае:

1) Ва ўсіх сэкцыях ІТР Беларусі на працягу 5-ці дзён пад кіраўніцтвам члена Бюро ІТР стварыць сэктары па эканомі паліва і электра - энэргіі, уцягнуўшы ў гэты сэктар дабраахвотнікаў з ліку ІТР і лепшых кваліфікаваных рабочых - ударнікаў.

2) Гэтаму сэктару на працягу 5-ці дзён разам з бюро рацыяналізацыі распрацаваць канкрэтны план працы, абгаварыўшы яго на шырокіх сходах ІТР і вытворчых нарадах.

3) Заключыць умовы па сацыялістычнаму спаборніцтву паміж сэкцыямі аднародных прадпрыемстваў на сапраўднае ажыцьцяўленьне высунутых у гэтых умовах мерапрыемстваў, накіраваных справай эканомна га выдаткаваньня паліва і электраэнэргіі.

4) Сэкцыям ІТР прыняць захады да таго, каб ажывіць працу існуючых на прадпрыемствах і ўстановах энэрга-бюро таксама па арганізацыі гэтых бюро там, дзе яны ня існуюць.

5) Стымуляваць працу тых таварышоў ІТР і рабочых рацыяналізатараў, якія займаюцца распрацоўкай каэфіцыенту моцнасьці электра-установак.

6) ІТС правесьці на працягу кастрычніка рад гутарак з рабочымі прад прыемстваў па пытаньнях эканомнага выдаткаваньня паліва і электраэнэргіі.

7) З маючыхся ў БелМБІТ грошай на санаторна - курортнае лячэньне вылучыць 3.000 руб. на забесьпячэньне ІТР - ударнікаў, якія ўносяць лепшыя прапановы ў адносінах эканоміі паліва і электра-энэргіі.

8) Прасіць ВСНГ вызначыць адпаведную суму з прэм'яваньнага фонду на прэм'яваньне лепшых рабочых - рацыяналізатараў і ІТР, якія дадуць найбольш каштоўныя прапановы на лініі эканоміі паліва і электра-энэргіі.

9) Прапанаваць ВСНГ з гэтай мэтай абвясьціць конкурс на лепшую прапанову ў адносінах эканомнага выдаткаваньня паліва і электраэнэргіі. -8

10) Выклікаць МБІТ Заходняй Вобласьці на сацспаборніцтва па лініі правядзеньня масавага паходу ІТР за эканомію паліва і электра-энэргіі.

Бел. МБІТ.

Абутковая ў барацьбе за якасьць

(З пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ па пытаньні становішча культработы фабкому абуткозай фабрыкі у барацьбе за якасьць выпусканай прадукцыі)

Прэзыдыум ЦСПСБ заслухаў даклад аб культработе абутковай фабрыкі, рэдакцыі шматтыражкі «Чырвоны Абутнік» і клюбу Скурнікаў гораду Менску, і прызнаў, што становішча на гэтым фронце зусім не задавальняючае.

У пастанове гаворыцца:

«Адзначыць станоўчую работу шмат тыражкі «Чырвоны Абутнік» па барацьбе за якасьць, аднак прызнаць не адвавальняючай барацьбу за дзейнасьць рабкораўскіх заметак. Як абсалютна недапушчальнае зьявішча, адзначыць слабае рэагаваньне, а часам і замоўчваньне раду рабкораўскіх заметак з боку адміністрацыі і фабрычна - заводзкага камітэту.

У сувязі з адсутнасьцю работы па барацьбе за якасьць прадукцыі і культработе на фабрыцы і ў клюбе, асабліва пры наяўнасьці платнага культработніка і загадчыка клюбу і прыняць адпаведныя меры да рэагаваньня.

Прапанаваць ЦП саюзу ўзмацніць канкрэтнае кіраўніцтва культработай, як на фабрыцы, так і ў клюбе, прыма цаваўшы для гэтай мэты на 2 тыдні адказнага работніка ЦП саюзу.

ЦСПСБ прапанаваў ФЗМК абуткоўвай фабрыкі правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) правесьці да 20-X-31 г. рад гутарак аб прычынах браку і мэтадах яго зьнішчэньня, арганізуючы збор рабочых прапаноў па гэтым пытаньні.

б) устанавіць культпасты па барацьбе за якасьць на абавязкі якіх усклась ці сыпналізаваць аб зрывах у сортнасьці і якасьці, афармляць чырвоныя і чорныя дошкі па якасьці, запісваць канкрэтныя віноўнікаў зрыву, набіраць матар'ял для выстаўку браку.

в) праводзіць 5-ці хвалінныя вытворчыя нарады па брыгадах спэцыяльна аб якасьці;

г) арганізаваць па ўсіх цэхах выстаўкі браку, сыстэматычна іх абнаўляючы і дабіваючыся пафамільна зьні жэньня колькасьці браку.

д) арганізаваць пераклічку цэхаў па барацьбе за якасьць і мабілізаваць праз усю сыстэму культработы рабочых на сталае ўключэньне цэхаў і брыгад за канвэер якасьці.

Прапанавана ІТР разгарнуць барацьбу за якасьць шляхам: арганізацыі збору прапаноў ІТР; арганізацыі гурткоў па аўладаньні тэхнікай для новых рабочых і слаба кваліфікаваных, даючых вялікі процант браку і нізкі процант сортнасьці; арганізацыі гутарак ІТР навакол выставак браку; арганізацыі старонкі тэхнікі ў «Рабочым абутніку».

Прасіць рэдакцыю шматтыражкі:

а) праводзіць сыстэматычныя штомесячныя рэйды ўдарных брыгад друку за якасьць;

б) склікаць сход рабкораў па тэтым пытаньні;

в) узяць пад асабліва нагляд выкананьне рабочых прапаноў па якасьці, сыстэматычна асьвятляючы ход выкананьня іх апэрацыйнымі сводкамі;

г) зьвязацца з рабкорамі і шматтыражкамі аб снабжэньні фабрыкі і заводаў па пытаньні добраякаснасьці сыравіны;

д) прасіць газэту «Рабочы» правесьці выкананьне ўсімі фабрычнымі арганізацыямі пастаноў II Усебеларускага зьезду рабселькораў на абутковай прамысловасьці;

е) прапанаваць ФК аказаць шматты ражкі поўную дапамогу ў гэтай рабоце.

ЦП саюзу скурнікаў арганізаваць культпалітсавет клюбу падшукаўшы адпаведную кандыдатуру на пасаду старшыні культпалітсавету клюбу.

а) да 20 кастрычніка 1931 г. склікаць вечар старых рабочых па пытаньні якасьці;

б) да 25 кастрычніка склікаць вечар абмену соцвопытам старых і новых рабочых;

в) арганізаваць уводныя курсы ў вытворчасьці для новых рабочых;

г) арганізаваць гурток на 100 чал. па аўладаньні тэхнікай;

д) забясьпечыць фабрыку плякатамі, лёзунгамі аб якасьці з лічбамі і прозьвішчамі, як па станоўчым, так і адмоўных бакох работы самой фабрыкі;

е) сыстэматычна праводзіць масавую працу, як у клюбе, так і на фабрыцы па пытаньні якасьці;

ж) да 1 лістапада правесьці вечар спатканьня вытворцаў з спажыўцамі, узяць на сябе ініцыятыву ў арганізацыі буксірнай брыгады рабочых спажыўцоў над брыгадамі, даючымі вялікую недобраякаснасьць прадукцыі.

Прапанаваць усім арганізацыям правядзеньнем масавай і растлумачальнай арганізацыйнай работы, дабіцца да 15 кастрычніка перавядзеньня па 1-й брыгадзе на гаспадарча сацыяльны разрахунак.

Прапанаваць школе прымацаванай да заводу разгарнуць масавую работу па барацьбе за якасьць (лёзунгі, плякаты, дэманстрацыі піянэраў, заключэньне сацумоў з бацькамі). Даручыць клюбу правесьці да 25 кастрычніка дзіцячыя раніцінкі на гэтую тэму. Прапанаваць ФЗКМ і клюбу прапрацаваць пытаньні якасьці ва ўсіх гурткох клюбу і ФЗМК.

Сацыялістычным гарадом-сацыялістычную гаспадарку

Праз усесаюзную пераклічку чырвоных сталіц узброімся вопытам лепшых

„Савецкая Беларусь" уключаецца ва ўсесаюзную пераклічку чырвоных сталіц

Падтрымліваючы ініцыятыву газэты «Вечерняя Москва», аб абмене вопытам сталіц Саюзу ССР у разгортваньні камунальнай і гарадзкой гаспадаркі і палепшаньні дабрабыту, газэта «Савецкая Беларусь» уключаецца ва Ўсесаюзную пераклічку чырвоных сталіц і разам з вызнной рэдакцыяй газэты «Вечерняя Москва» і іншымі газэтамі БССР разгорне масавую работу і мабілізуе сваіх рабселькораў на правядзеньне праверкі выкананьня пастаноў чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб развіцьці камунальнай і гарадзкой гаспадаркі.

Рэдакцыя газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ».

Дабрабыт ваколіц—адсталы вучастак

(Агляд лістоў рабселькораў)

Партыя і ўрад высунулі цэлы рад канкрэтных задач у перабудове камунальнай гаспадаркі ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і СНК БССР даволі выраз на і канкрэтна паставілі гэтыя задачы перад усімі партыйнымі, савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі.

Пленум ЦК УсеКП(б) лічыць, што да **«пытаньняў рэконструкцыі камунальнай гаспадаркі прыкоўваецца ўвага ўсёй партыі і рабочае клясы. Гэта значыць, што на даным вучастку ў бліжэйшы час патрэбен і будзе створаны пералом».**

У нас, у БССР гарадзкая гаспадарка вельмі адстала. Асабліва моцна пацярпела БССР ад розных акупацый у час грамадзянскай вайны. За годы рэвалюцыі мы ня толькі аднавілі гарадзкую гаспадарку, але маем цэлы рад дасягненьняў па аднаўленьні новым будаўніцтве камунальнай гаспадаркі. Але тэм пы будаўніцтва камунальнай гаспадаркі яшчэ адстаюць ад шпаркага сацыялістычнага будаўніцтва.

Добрабыт ваколіц—адсталы вучастак, у камунальнай гаспадарцы. Вось што піша нам **тав. В.**

«Па Ізвозным вул. (Менск) пабудован пасёлак з 6 дамоў, які заселен пераважна рабочымі. Гаспадаром гэтых дамоў зьяўляецца Менкамгас. Трэба сказаць, што ня ўсе дамы скончаны пабудовай. Акнаніцы не навешаны, некаторыя дамы не пашпаклеваны. Да гэтага часу камгас не пабудаваў пратуараў і ў дрэнным надвор'е на пасёлцы стаіць непраазная гразь, ужо не гаворачы аб тым, што пасёлак не асьвятляецца.

— Ці так трэба выконваць наказ выбаршчыкаў—пытае тав. В.

З **Сьмілавіч** селькор Крок паведамляе, амаль тыя-ж факты ў галіне дабрабыту м. Сьмілавіч.

Ня меншае значэньне мае пажарная акова, якая ў многіх мясцох пастаўлена вельмі дрэнна.

У Менскім прыгарадным саўгасе—пішча тав. **Падарожны,**—маецца дабраах вотная пажарная дружына, якая лічыц ца толькі на паперы. Няма пажарных струментаў і ня гледзячы на тое, што на сходах пажарнікаў ня раз аб гэтым гаварылася, нічога не дапамагае. «Нам больш нічога ня трэба як пажарныя куткі і хромавыя боты»—заяўляюць некаторыя пажарнікі.

Брыгадзір «Савецкай Беларусі»—т. **Розэс** піша аб тым, што ў Міранскай добраахвотнай пажарнай дружыне няма зацікаўленасьці работай па супроць пажарнай ахове. Пры адкормачным пункце ў мінулую зіму быў два разы пажар і ўсё-ж адміністрацыя адкормачнага пункту не займаецца пытаньнямі пажарнай аховы.

На сёньняшні дзень мы павінны канстатаваць ,што на паасобных вучастках камунальнай гаспадаркі яшчэ няма належнага пералому, там пастанова партыі і ўраду аб камунальнай гаспадарцы невыканана.

Перад партыйнымі, савецкімі і гаспадарчымі арганізацыямі пастаўлена задача аб перабудове работы камунальнай гаспадаркі і наданьні гэтай рабоце значэньне баявой задачы «па хутчэйшай ліквідацыі адставаньня гарадзкой гаспадаркі ад агульнага разьвіцьця» і «рашучым пераломе ў плянах яе разьвіцьця».

Б.

За шырокі абмен вопытам

У газэце «Зьвязда» зьмешчаны наступны артыкул рэдактара «Вечерней Москвы» тав. Цыпіна:

Рэдакцыя «Вечерней Москвы» разгарнула кампанію за абмен вопытам сацыялістычнай перабудовы 7 савецкіх сталіц.

У радзе сталіц ужо разгортваецца збор матар'ялаў., У бліжэйшыя дні мы зможам паказаць працоўным Масквы малюнак росту, перабудовы, сацыялістычнай рэканструкцыі ўсіх саюзных рэспублік.

Першай адгукнулася ташкенцкая **«Узбекистанская правда».**

— «Вашы прапановы, — пісалі нам таварышы з **Ташкенту** ў першай тэлеграме, — аб абмене вопытам рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі пры маем. Сваёй цэнтральнай задачай ста вім барацьбу са спадчынай калёнізатарскага мінулага — падзелам гарадоў Узбекістану на стары і новы. На аснове пасьлядоўнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі будзем дамагацца пераўтварэньня Ташкенту ва ўзорны сацыялістычны горад на Савецкім Усходзе. Вопыт Масквы, неаслабнае падтрыманьне пралетарскай грамадзкасьці саюзных сталіцы дадуць магчымасьць дапамагчы Узбекістану дасягнуць узроўню перадавых раёнаў Саюзу».

Следам за Ташкентам адгукнуўся **Харкаў.** У сваёй тэлеграме рэдакцыя **«Харьковського пролетария»** піша: «Мы згодны арганізаваць уваемны аб мен вопытам рэканструкцыяй камунальнай гаспадаркі. Чакаем вашых рабочых плянаў».

Тыфліскія таварышы тэлеграфуюць: **«Заря Востока»** вітае ідэю ўзаемнага абмену барацьбы за рэканструкцыю камунальнай гаспадаркі. Падрабязны плян высылаем поштай».

Ленінградзкая «Красная газета», якая ўключылася ў пачатую намі кампанію па абмене вопытам перабудовы чырвоных сталіц адзначае: «Мы ахвотна падзелімся вопытам добрабыту Ленінграду, і ня менш ахвотна возьмем вопыт іншых гарадоў, асабліва Масквы з яе ўдарнымі культурнымі вуліцамі». Рэдакцыя «Красной газеты» абавязуецца прыцягнуць да гэтай справы перадавікоў - ударнікаў і навуковых работнікаў выдаўна арганізаванага ў Ленінградзе Ўсесаюзнага навукова - дасьледчага інстытуту камунальнай гаспадаркі.

Такім чынам, у нашу кампанію ўжо ўключыліся ўсе саюзныя сталіцы за выключэнь

ДА ПАЧАТКУ ЛЁДАСТАВУ

ніводнай калоды не павінна застацца ў вадзе

15 кастрычніка скончыўся тэрмін сплаўнога сэзону, а пляны лесасплаву на рэчках Прыпяць, Бярэзіне, Сожа - Дняпроўскай сплаўнай канторай недавыкананы. Мабілізаваць масы лесарубаў і возчыкаў на фарсаванае вывазкі лесу і дроў да прыстаняй

Лесасплаў на вярхоўі Сожу пад пагрозай зрыву

Па Верхняй - Сожскім сплаўным участку работа па возцы і сплаве драўніны праходзіць дрэнна. За дэкаду з 20-IX па 1-X г. г. звязана і пушчана сплавам толькі 3.075 куб. м. Есьць ня зьнязанай на гэты час 15.743 куб. м., з гэтай колькасьці больш 30 проц. знаходзіцца на выплавачных рэках.

Пры наяўнасьці такіх тэмпаў працы, наближэньні канца навігацыі і пры становішчы, калі сплаў плытоў з вярхоўяў Сожу працягваецца да Гомелю больш месяца, прыходзіцца канстатаваць, што сплаў пад пагрозай зрыву. Загадчык вучастку таварыш Глевіцкі мала думае аб сплаве, —ён пайшоў у адпачынак на цэлы месяц.

Шмат затрымак здарылася ў працы на гэтым вучастку з-за кепскага забесьпячэньня сплаўшчыкаў і адсутнасьці прамтавараў. Нім. Загадчыка вучастку ня толькі нічога не прадпрыняў у вырашэньні гэтага пытаньня, але нават не паведаміў сплаўканторы.

Сплаўканторы трэба зьвярнуць на гэта сваю ўвагу і вырашыць пытаньне сплаву Верхняй - Сожскага сплаўвучастку.

К. Д.

293417 кубамэтраў драўніны пагражае замерзнуць у вадзе

Па Сожска-Дняпроўскай сплаўнай канторы ў сёлетнюю навігацыю па пляну патрэбна сплавіць 861.707 куб. м. драўніны. На 10-е верасьня леспрамгасамі падвезена да прыстаняй 568.290 куб. м. драўніны. Пушчана сплавам 528.331 куб. м., выканана да падвезенага 92 проц., да агульнага пляну — 61 проц. Прыбыло і здана спажыўцам 484.572 куб. м. або 84 пр. да падвезенага і 56 проц. да агульнага пляну.

Выкананьне агульнага пляну ідзе марудна. Сплаўкантора з работай не спраўляецца.

Дзе-ж корань зла?

Леспрамгасы: Горацкі, Чэрыкаўскі, Клімавіцкі, Чачэрскі, Рэчыцкі і Гомельскі вельмі мала вывозяць да прыстаняй. У жніўні быў абвешчан месячнік па вывазцы і за ўвесь жнівень вывезена да прыстаняй толькі 8.568 куб. м., а за дзесяцідзённку (з 1-IX па 10-IX) зусім няма зьвестак.

Да канца навігацыі сплаўкантора павінна сплавіць яшчэ 333.376 куб. м., а леспрамгасы павінны адвесьці яшчэ да прыстаняй 293.417 куб. м., якія зна ходзяцца яшчэ ў лесе. Час, калі замерзьне рака, невялікі, асабліва для верхавіне Сожу і Бесядзі. Леспрамгасы пры такіх тэмпах вывазкі лесаматар'ялаў да прыстаняй ня справяцца з плянамі і 293.417 кубамэтраў зазімуюць. Даць зазімаваць такой колькасьці драўніны, гэта значыць пакінуць без вялікай колькасьці сыравіны нашы заводы, фабрыкі і горад без апалу.

Сплаўкантора для ліквідацыі прарыву па вывазцы вылучыла частку штата і перадала яго леспрамгасам. Патрэбна неадкладна, усім РВК, сельсаветам, РСІ разам з леспрамгасамі ўзяцца за вывазку.

Каган, Дамонаў.

Дабіцца рашучага пералому на лесасплаве

Менск. 21-X. Хутка канчаецца сэзон сплаву. Здавалася-б зараз тэмпы яго павінны быць як мага ўзмоцнены і напружаны. У сапраўднасьці-ж адчуваецца яўная павольнасьць. Да 15 кастрычніка спушчана на ваду ўсяго 64 проц. заданьня.

Аднэй з галоўных прычын такога становішча зьяўляецца ненармальная падвозка драўніны да месцаў спуску на ваду. Леспрамгасы злачынна бязь дзейнічаюць у гэтай справе. Лесбел толькі задавальняецца адсылкай паперак. Адчуваецца таксама недахват рабочай сілы (патрабуецца 7.491 рабочы, працуе-ж усяго 5.827 рабочых).

Бесчынная становішча з выцяжкай калод з рэк. Асабліва яно дасягнула сваёй вышыні на Прыпяці. Лес, які прыбывае для фанэрнай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» у Мазыры, за палкавай фабрыцы ў Капцэвічах, лесапільнага заводу «Пралетары» вы пружаецца павольным тэмпам. Расплываюцца асобныя калоды і цэлыя паркі. Ніякіх захадаў для лоўлі ня прымаецца. Адміністрацыя гэтых прадпрыемстваў глядзіць на гэта скрозь пальцы.

Нарэшце трэба адзначыць слабую мабілізацыю грамадзкай увагі вакол сплаву. Партыйна - камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі сплаўных раёнаў нічым канкрэтным не дапамагаюць. узьняцьцю тэмпаў падвозкі драўніны да месцаў спуску на ваду, узьняцьцю тэмпаў самога сплаву і выгрузкі. (Белта).

Да адказнасьці зрыўшчыкаў у забесьпячэньні прамысловасьці і рабочых апалам

Чэрыкаўскі леспрамгас у ліпені і жніўні вывез да прыстані ракі Сенкі (прыт. верх. Сожу) больш 3000 куб. мэтраў дроў і за ўвесь час не паклапаціўся забясьпечыць вязачнымі прыладамі і перацяжкамі вязку плытоў. З-за адсутнасьці прыслужных прылад, а таксама з-за малай вады гэтыя дровы засталіся зімаваць на прыстані.

Сплаўкантора, маючы на ўвазе, што рака Сенка ўлетку зусім малаводная, і што дровы нельга будзе сплавіць, была проці вывазкі, але працаўнікі Чэрыкаўскага леспрамгасу з гэтым не палічыліся і зрабілі па свайму—дровы вывезьлі.

Дровы вывозіліся з лесасек да р. Сенкі на адлегласьці 26-28 кілёмэтраў, на вывазку затрачана шмат сродкаў і гэта не дало ніякай карысьці. Чэрыкаўскі леспрамгас меў поўную магчымасьць гэтыя дровы вывезьці проста да ракі Сожу, адсуль-бы яны пры наяўнасьці прыслужных і вязачных прылад, былі-б даўно сплаўлены.

У зімовы час гэтыя дровы трэ' будзе вазіць з р. Сенкі да пад'ёмных прыстаняй Сожу, на адлегласьці 20 клм. і толькі ў 1932 годзе вясной іх прыдзецца сплавіць.

Такім чынам кіраўнікі Чэрыкаўскага леспрамгасу сарвалі сплаў 3000 куб. м. дроў прызначаных для рабочых і прамысловасьці горада Гомелю, а таксама страцілі дарэмна шмат сродкаў на вывазку.

Зараз наша прамысловасьць і горад больш як на 30 проц. недазабясьпечаны апалам, які павінен быў быць сплаўлен вадой з леспрамгасаў і цяпер недавыкананую колькасьць сплавам дроў, прыдзецца вывозіць транспартам па чыгунцы, што пацягне за сабой лішнія выдаткі.

Органам пракуратуры патрэбна заняцца гэтай справай, вінаватых у зрыве сплаву і невыкананьні пастаноў партыі і ўраду прыцягнуць да адказнасьці.

Рабкор.

Ня даць замерзнуць калодам

Калі едзеш з Мазыру ў Тураў увесь час толькі і бачыш масу раскіданых калод, якія плывуць па рэчцы і шукаюць сабе прыпутку. Але тыя бесгаспадарнікі, па віне якіх калоды засталіся ў рэчцы і плывуць, ня прымаюць ніякіх мер да таго, каб выратаваць гэтыя калоды.

Мазырскай сплаўканторы трэба вылавіць з вады ўсе калоды, бо хутка замерзьне рака і ёсьць пагроза, што лес замерзьне.

Палхоўскі.

Бабруйск адстае ў выкананьні плянаў дрова-лесазагатовак і вывазкі

Бабруйск. 16-X. Плян загатовак дроў Бабруйскім Леспрамгасам за III-ці квартал выкананы усяго на 25,4 проц., а па вывазцы на 29,6 проц.

Па загатоўцы будаўнічага матар'ялу плян выкананы на 73 проц., а па вывазцы — на 49 проц. Апошняя дэкада дае яшчэ горшыя вынікі: заданьне па загатоўцы дроў выканана ўсяго на 30 проц., а па вывазцы—на 3 проц. У лесе замест 1.500 чалавек працуе толькі 500 чалавек, на вывазцы працуе замест 800 фурманак 500. Адпрузка дроў за верасень выканана на 33 проц., а за кастрычнік 7 проц. У апараце Любоніцкага вучастку працуе 70 чалавек, а ў лесе 13 кастрычніка працавала толькі 50 рабочых.

Леспрамгас да гэтага часу не перабудаваў сваёй працы на ўдарныя рэйкі для забесьпячэньня выкананьня пляну лесазагатовак і вывазкі. Некаторыя вучасткі ўвесь час спадзяюцца на самацёк. Да заключэньня дагавораў на рабочую сілу ня прыступлена. Арганізаваны Леспрамгасам уласны абоз працуе са значным дэфіцытам. Пры абозе да гэтага часу няма рабачкому. Ільготы прадстаўленыя ўрадам занятым сялянам на лесараспрацоўках і вывазцы сярод сялянства не папулярызаваны.

Неабходна тэрмінова прыняць рашучыя захады на ліквідацыю прарыву. (Белта).

Рыхтуюцца к перавыбарам ФЗМК

Па прафсаюзам БССР разгарнулася падрыхтоўчая работа да перавыбараў ФЗМК і агляду прафработы.

ЦП прафсаюзу грамадзкага харчаваньня на днёх разасланы па мясцох дырэктыўны ліст аб арганізаваньні падрыхтоўчай работы.

ЦП саюзу выдзеліла брыгаду з 3-х чалавек у дапамогу Менскім ФЗМК саюзу харчавікоў.

Мясцовыя арганізацыі саюзу ўключаюцца ў абвешчаны конкурс ЦК прафсаюзу харчавікоў на лепшую пастаноўку прафработы.

Харчавікі Заходняй вобласьці выкліканы беларускімі харчавікамі на сацыялістычнае спаборніцтва.

З 26 кастрычніка па 3 лістапада будзе праводзіцца падрыхтоўчая работа ў Гомлі па ТСТ, Добрушу, Рэчыцы, Мазыры і Калінкавічах. Справаздачная кампанія тут будзе праведзена з 3 па 12 лістапада.

Групкомы Бабруйску, Жлобіну, Рагачэву і Слуцку праводзяць падрыхтоўчую работу з 20 кастрычніка па 1 лістапада; справаздачную кампанію—з 1 па 10 лістапада і выбарчую з 10 па 20 лістапада.

Магілеўскі, Асіпавіцкі, Быхаўскі і Шклоўскі групкомы — падрыхтоўчую работу праводзяць з 20 кастрычніка па 5 лістапада; справаздачную кампанію—з 5 па 15 лістапада і перавыбары з 15 па 25 лістапада.

Групкомы Барысаву, Воршы і Горак праводзяць падрыхтоўчую работу з 25 кастрычніка па 4 лістапада, справаздачная кампанія тут будзе праведзена з 4 па 14 лістапада, перавыбары—з 14 па 25 лістапада.

Усім групкомам дадзен тэрмін у адну дэкаду для правядзеньня перавыбараў, каб апошнія не расьцягваліся на доўгі тэрмін.

Для падрыхтоўкі прафкадраў арганізуюцца курсы цэхкамітэтаў на 60 чалавек.

У найбольш буйныя прафарганізацыі пасланы члены ЦП для правядзеньня падрыхтоўчай работы да перавыбараў.

Уся работа ўвязваецца з адозвай УсеЦСПС.

***

Па саюзу камунальнікаў таксама маецца дакладны распарадак правядзеньня усёй кампаніі па перавыбарам нізавых профорганаў.

Па Менскім трамваі ліквідавана абязьлічка і важатыя прымацованы к трамваям.

Такая работа разгорнута і па іншых саюзах, як скурнікаў, мэталістаў і інш.

***

ЦСПСБ камандыраваў у раёны 107 курсантаў прафкурсаў для ўдзелу і дапамогі мясцовым прафарганізацыям у рабоце па справаздачна-перавыбарчай кампаніі прафорганаў.

Л. П.

ЛЕЗУНГІ

да перавыбараў фабрычна-заводзкіх і мясцовых камітэтаў

1. Пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі і яе ленінскага ЦК правядзем перавыбары прафарганізацый—генэральны агляд прафсаюзнай работы.

2. Справаздачна-перавыбарчая кампанія фабрычна-заводзкіх і мясцовых камітэтаў—агляд работы прафсаюзаў па праверцы выкананьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

3. Пад агонь бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі дзейнасьць прафарганізацый, скарыстаўшы яе як сродак выяўленьня недахопаў і як зброю палепшаньня нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

4. Прафсаюзы ствараем да выпорчасьці». Прэч апалітычнасьць, цэхаўшчыну і прэд-юнізм у рабоце прафсаюзаў.

5. Агонь па «дзядзькай» ўраўнілаўцы. Прафработнікі змагайцеся з апартуністычнай практыкай.

6. Увага рашучым вучасткам сацыялістычнага будаўніцтва. Транспарт, вугаль і мэталь—пад агонь бальшавіцкай самакрытыкі.

7. Шырэй дарогу ўдарным брыгадам! Пад знакам далейшага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва забясьпечым арганізацыю гаспадарчарэзьлікавых брыгад, зьмена-сустрэчнае плянаваньне і скраных брыгад.

8. За перабудову тарыфнай сыстэмы, за пераход на прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну, за лепшае забесьпячэньне аплаты ўдарных прафэсый.

9. Праявім бальшавіцкі напор, ленінскую настойлівасьць і арганізаванасьць у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну 4-га кварталу і падрыхтоўку да сустрэчы 1932 г.

10. «Нам засталося намнога: вывучыць тэхніку, авладаць навукай, і калі мы зробім гэта, у нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх мы зараз і марыць ня сьмеем». (Сталін).

11. Ганьба дэзэртырам сацыялістычнай перабудовы: лятуном, прагульшчыком, рвачом.

12. За выкананьне дырэктыў партыі і ўраду па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, за сапраўдную зьдзельшчыну, ліквідацыю абязьлічкі, за датэрмінове выкананьне загатовак і мабілізацыю сродкаў.

13. Рабочыя чыгуначнікі! Узмоцнім прафпысьпліну за здаровы паравоз, за чоткі рух цягнікаў, за 100 проц. скарыстаньне вагоннага парку.

14 Рабочыя МТС! За максымальнае разгортваньне працы па ўзмацненьні існуючай сеткі МТС, шырокая мабілізацыя сродкаў на будаўніцтва новых і максымальнае скарыстаньне машына-трактарнага парку ў выкананьне задач сацыялістычнай перабудовы вёскі.

15. Выканаем дырэктывы партыі па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі—карэнна палепшым рабочае забесьпячэньне.

16. Яшчэ больш разгорнем барацьбу з бюракратызмам у апаратах—праз шэфства і яго вышэйшыя формы—сац намесьніцтва.

17. Правядзем бальшавіцкія тэмпы па мабілізацыі грашовых сродкаў у IV-м квартале 1931 г.

18 Лепшых ударнікаў арганізатараў, важакоў рабочых мас актыўстак-рабогніц, рабочую моладзь—абраем у склад фабрычна-заводзкіх і мясцовых камітэтаў.

19. Забясьпечым 100 проц. яўку членаў прафсаюзаў на перавыбары фабрычна-заводзкіх камітэтаў. Кожны член саюзу павінен даць прапановы па палепшаньні прафсаюзнай работы.

20 За палепшаньне матар'яльна-культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых і работніц, за узорную работу сталовак, ЗРК, ясьляў, пляцовак, клюбаў, чырвоных куткоў, за санімінімум на прадпрыемствах і ў кватэрах рабочых.

21. Перавыбары прафарганізацый павінны ўзьняць на вышэйшую ступень інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых і работніц. Забясьпечым сапраўднае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

22. Безьлітасная барацьба з вялікадзяржэўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з беларускім контрэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмам розных колераў.

23. За беларускую культуру—сацыялістычную па зьместу і нацыянальную па форме. За авладаньне беларускай мовай пралетарамі розных нацыянальнасьцяй.

24. Праверкай выкананьня ўзятых абавязкаў па сацдогавары з Зах. вобласьцю забясьпечым далейшы рашучы ўдым нашай гаспадаркі і палепшаньне матар'яльна-бытавых умоў рабочае клясы.

25. За выхаваньне новых пралетарскіх кадраў—адданых сацыялістычнаму будаўніцтву.

26. Усё на абарону СССР! Узмацнім рабочае шэфства над часткамі Чырвонай Арміі.

27. Максымум увагі з боку партыйных арганізацый і друку перавыбарчай кампаніі прафсаюзаў.

28. Лепшых пралетараў, калгаснікаў, батракоў і беднякоў у рады ленінскай партыі. Пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі і яе ЦК наперад да новых перамог! Вышэй сьцяг Усе КП(б)!

Ліст да рэдактара

З лістом зьвяртаюся, таварыш, я да вас.
Магчыма, здасца ён вам крышку нязвычайным
Ды мо' й ня надта вам цікавы пераказ
Маіх сумненьняў і маіх расчараваньняў.

Так многа шкоднага я напісаў калісь,
Глыбока так упруз я ў балотнай тванi...
Супроць мінулага свайго праз гэты ліст
Я выступаю, як паэт і грамадзянін.

Калі, апраўлены ў высокія страі
Пачатак сацыялістычных дзён заняўся,
Расталі межы ў расплаўленай фальлі
І ў рашучы бой на клясу вышла кляса;

Калі жыцьцё вышэй ўставала ад праграм.
І кожны мускул быў энэргіяй наліты,—
Тады з патайных нор, тады з-пад цёмных брам
Стаў вораг выпаўзаць, калісьці недабіты.

На дыбы вораг стаў, каб свой пасат стары
Вярнуць і аднавіць, і ўваскрэсіць з нябыту
Са сьцягам Вітаўта маёнткі, хутары,
І казаньні зайца Касьяна Вераміты.

Каб у засыпанках зноў крыззвіўся абцас
Каб для жмутка пражэр гнуў горб мільён галодных,
Каб путы брэзгалі, як некалі ў нас,
Як і цяпер яшчэ ў Вільні і Гародні.

Ці мала знойдзецца ў Парыжы махляроў,
Ці мала знойдзецца ў Варшаве ягамосьцяў,
Што рады-б за працоўных пот і кроў
Даць мясу сытую нацдэмаўскім прахвостам?!

І з кожнага кутка атрута пацякла:
З сяброўскага ліста, з вучонага дакладу...
Як пошасьць чорная, як кайнава мгла
З усіх глухіх шчылін насунулася здрада.

Хто вочы не закрыў, хто вушы меў,
каб чуць,
У кім нянавісьць жыла, забыўшы лёгкавернасьць,
Той пільна глянуў скрозь хлусьні і здрады муць
І ўбачыў змрочны твар навалы крыважэрнай.

Самкнулася шчыльней рабочая сям'я
З працоўным сейбітам—сваім адвечным другам—
І адштурхнула ўсіх, хто вышаў у імя
І самабытнай і несамабытнай пугі.

А я, нікчэмнасьцю прываблены юнак,
Атручаны ўшэнт шавіністычнай муцьцю,
З дароті сасьлізнуў і ворагам наўзнак
Аддаў на службу усё—і сілы і пачуцьці.

І ўвесь загіпнатызаваны іх маной
У маскі іх фальшывыя я верыў,
Ня бачыўшы таго, што й за маёй сьпіной
Ужо маячыць цень крывавы Бэльвэдэру.

Я зброю скіраваў сваю супроць таго,
З кім ад сьвітаньня дзён ісьці імкнуўся поплеч;
Аж гаснуць стаў у душы імклівасьці агонь
І кветкі сэрца усе павялі і пасохлі.

Калі-ж рашучы і руйнуючы удар
Усе маскі пазрываў і твары ўсе зьнячыў,
Я не паверыў сам, сярод якіх пачвар,
Сярод якіх зьвяроў я сам сябе пабачыў.

Страшыдлы, касьцякі з мачыльнікаў старых,
Што ўжо, здавалася, даўно згнілі і зьніклі,
Як воспрыя нажы бліснулі пазуры,
Забойства прагных наставіліся іклы.

І жудка стала мне і з воч тады маіх
Упала лухта ўся, што зірк мой затуляла:
Убачыў прорву я ля самых ног сваіх,
Адчуў вакол сябе варожую навалу.

Тады я ворагам зрабіўся сам сабе
І свой прысуд цяпер падпісваю сам я:
У безьлітасной вайне, у закітай барацьбе
Я мушу змыць з сябе ганебнай здрады пляму.

Зноў ясны погляд мой і сэрца ня дрыжыць.
І, калі вораг зноў ўзьнясецца згубнай заданьню,
Дык у апошні бой на першым рубяжы
Я з песьняй і штыхом яму насустрач стану.

Хай полымя мастоў за мной гарыць да зор.
На бёрды новыя я навіваю сон
І буду ткаць на іх квітнеючы ўзор
Нязломнай барацьбы, жыцьця і будаўніцтва.

Ал. Дудар.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Менгарком КП(б)Б на 25-га кастрычніка г. г., а 6-й гадзіне ўвечары ў Залі паседжаньняў (3-ці паверх) склікае нараду вучотнікаў-статыстыкаў і збор чыгункаў членскіх узносаў усіх партколектываў і ячэек КП(б)Б.

На нараду павінны таксама зьявіцца абавязкова тэх. сакратары ўсіх вытворчых п-к і ячэек КП(б)Б.

Менгарком КП(б)Б.

Менгарком КП(б)Б склікае 25-га кастрычніка г. г. а 2-й гадзіне дню ў памяшканьні Менгаркому (3-ці паверх, заля пасяджэньняў) нараду дырэктароў прадпрыемстваў гор. Менску і дырэктароў аб'яднаньняў ВСНГ.

Парадак дня:

Аб новых мерапрыемствах па ўзнаўленьню гаспадарчага разрахунку.

Яўка абавязкова.

Менгарком КП(б)Б.

На 27-е кастрычніка 1931 г., а 10 гадзіне раніцы ў памяшканьні Менгаркому (3-ці паверх) склікаюцца сакратары вяковых ячэек па пытаньні аб становішчы партасьветы.

Менгарком КП(б)Б.

Пэдгабінэт. 26 кастрычніка, а 7 гадзіне ў вечары будуць працаваць 3 і 4 групы.

Інстытут Літаратуры і Мастацтва БАН сумесна з Пэдгабінэтам.

26-га кастрычніка г. г., а 7 гадзіне ўвечары ў Пэдгабінэце пры Доме Працаўнікоў Асьветы адбудзецца паседжаньне сэкцыі літаратуры, на якім проф. Пётуфовіч зробіць даклад: **«Тэма калгаснага будаўніцтва ў асьвятленьні розных клясавых напрамкаў сучаснай беларускай літаратуры».**

(Да пытаньня аб пастаноўцы тэматычнага выкладаньня літаратуры).

На сход запрашаюцца рабочыя літаратурныя гурткі, пісьменьнікі выкладчыкі мовы і літаратуры, навукоры працаўнікі БАН і асьпіранты.

Уваход вольны.

ПАПРАЎКА

У 11 п. пастановы СНК БССР пра лесазагатоўкі і лесавывазкі, зьмешчанай у «С. Б.» за № 246, пасьля слова завоз памылкова трапіла слова **клеба.**

Адказны рэдактар
П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР ВОЕНАЙ ОРКА*	Новы амэрык. фільм Далёка палымеючы скал Дз. ў 7 част Пач а 7 8-45; 10 30 каса 5
КІНО-ТЭАТР ПРАЦУРА	Замежны фільм Сапраўдныя паны у 8 част. Зьвыш праграм Ударная будоўля Пач. а 7 г.
КІНО-ТЭАТР ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ	І. Сялёныя хлопцы II. Вечар адпачынку (У камэдыі Чарлі Чаплін) (Пачатак а 7 гадз.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ»	Мастацкі фільм РЕ ШЛЯХ Зьвыш праграмы ПЕРШАЯ ДАП-МОГА II чат. і сэансу а 2

АБВЯШЧАЕЦЦА ДА ВЕДАМА
ўсіх навучальных
устаноў,
гаспадарнікаў на праходжаньне вытворчае практыкі
на дрэваапрацоўчых заводах
ў леспрамгасах Беллеспрому
на 1932 год
ПРЫМАЮЦЦА
СЭКТАРАМ КАДРАЎ
БЕЛЛЕСПРОМУ
ад 20 X да 10-XI 1931 г.
Навучальныя ўстановы, якія не прышлюць заяўкі ў паказаны тэрмін, ня будуць ўключаны ў плян, і месц для прахаджэньня вытворчае практыкі ня атрымаюць.
БЕЛЛЕСПРОМ

КОШТ публікацыі АБ ЗГУБЕ АДНАГО дакуманту 1 р.

ПАСТАНОВА № 32

Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету ад 19-X 31 г.

АБ ПАЖАРНЫМ ДЭКАДНІКУ

1. У мэтах папярэджаньня пажараў у жыльлёвых, гандлёвых будынках і ўстановах гор. Менску і сельскіх мясцовасьцях гарадзкой мяжы і праверкі выкананьня абавязковай пастановы Менгарсавету за № 16 ад 10-V 31 г. аб супроцьпажарных правілах, Прэзыдыум Гарсавету абвяшчае супроцьпажарную дэкаду—у горадзе з 25-X па 5-XI і ў сельскіх мясцовасьцях—з 10 XI па 20-XI 31 г.

2. На працягу дэкадніка праверыць:

а) спраўнасьць апалавых прыладаў (печкі, пліты, коміны і г. д.);

б) наяўнасьць у памяшканьнях жалезных часовых печак і труб, устаноўленых не па правілах і без дазволу ўправы пажарнай аховы;

в) сваячасовую і якасную ачыстку комінаў ад сажы;

г) утрыманьне падстрэшшаў;

д) наяўнасьць прыстаўных драбін да страх апальваных будынкаў;

е) утрыманьне выхадаў лесьніц і лесьнічных клетак;

ж) становішча двароў, праездаў і пад'ездаў да будынкаў;

з) парадак хаваньня паліва і гаручых вадкасьцяй;

і) забясьпечаньне вадой сельскіх мясцовасьцяй.

3. Для правядзеньня гэтай працы мабілізаваць актыў МГПК, МДПД, фабрычна-заводзкія і сельскія пажарныя дружыны.

4. Кіраўніцтва па правядзеньні дэкады супроцьпажарнай аховы ўскласьці на начальніка ўправы пажарнае аховы гораду тав. Казачэнка.

5. Прапанаваць праўленьням жактаў, дамакіраўніцтвам, камэндантам будынкаў гандлёвых і іншых устаноў бесьперашкодна дапушчаць брыгады пажарнай аховы да агляду і праверкі супроцьпажарных мерапрыемстваў, а таксама аказваць дапамогу ў гэтай справе.

6. Абавязаць міліцыю і сельскія саветы аказваць дапамогу ў правядзеньні працы па супроцьпажарным дэкадніку.

7. Для рамонту комінаў і апалавых прыладаў у дамаўладаньнях—абавязаць Менбуд і Гаржылсаюз вызначыць фонд цэглы ў 10.000 штук. Выдачу цэглы ў горадзе ўтварыць па даведках управы пажарнае аховы, а ў сельскіх мясцовасьцях па даведках начальнікаў пажарных дружын, засведчаных сельсаветам.

8. 29-XI г. г. на Прэзыдыуме Савету заслухаць даклад начальніка ўправы пажарнае аховы аб выніках правядзеньня дэкадніка.

Старшыня Менгарсавету ВАЛОДЗЬКА
Сэкратар ШАЛКАВЕЦ

МЕНСКІ БУДАЎНІЧЫ ТРЭСТ ПРОСІЦЬ УСЕ ВЕДАМ ТЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ ПАЗЬНЕЙ 25 кастрычніка ПРАДСТАВІЦЬ ТЫТУЛЬНЫЯ СЬПІСЫ

аб'ектаў будаўніцтва, якія маркуюцца да перадачы Менбуду на 1932 год

Весткі па гэтых аб'ектах прадстаўляць у наступнай форме

Работа-даўца	Назва будоўлі	Аб'екты пабудовы і тып будынкаў	Кубат. у куб. мтр.	Тэрміны	
				Пачат.	Скан.

Гэтыя весткі патрэбны для складаньня заявак НА ПАТРЭБНЫЯ МАТАР'ЯЛЫ І РАБОЧУЮ СІЛУ

Работы па аб'яднаньнях і ведамствах, якія не прадставілі патрэбуемых матар'ялаў да паказанага тэрміну, ня будуць уключаны ў кантрольныя лічбы Менбуду

Паказаныя заяўкі дасылаць па адрасе—Менск, Менбуд, Пляц Волі, 4

МЕНБУДТРЭСТ

25-га кастрычніка а 6 гадз. увеч. ў памяшканьні ЦКК НК РСІ Бел. (Савецкая, 55 у габінэце тав Калініна, пакой № 12,

СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА

сэктараў праверкі выкананьня ўсіх наркаматаў, цэнтральных, гаспадарчых, кааперацыйных аб'яднаньняў з наступнай абвесткай дня:

1. Даклад Плянава-Кантрольнай Групы ЦКК НК РСІ Бел. аб выніках абсьледваньня і задачах, формах і метадах работы сэктараў праверкі выкананьня. (Дакл тав Гэрлман).

2. Даклады кіраўнікоў сэктараў праверкі выкананьня НКФ'ну, Белкаапсаюзу, ВСНГ Бел. і Дзяржплану аб пастаноўцы работы ў іх

На нараду запрашаюцца кіраўнікі Наркоматаў, заг. арг. аддз., члены калегій і члены праўленьняў, в лучнай адказным за арганізацыю пастаноўкі праверкі выкананьня, кіраўнікі рэдакцый цэнтральных газэт, старшыні мясцовых, раённых і гарадзкіх выканкамаў.

Просьба на нараду з'явіцца ад с заяўленьня.

ЦКК НК РСІ БССР.

ПРЭЗЫДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ЗГУБЛЕНЫ:

Пасьведчаньне аб сканчэньні Пэдфаку БДУ за № 132 на імя Маслава Н. С., квіт. 423.

Мэтрычны выпіс Крывец Г. Ф., выд. Менскім ЗАГС-ам, квіт. 414.

Партбілет за № 0808950 Клімава І. Ф., выд. Гомельскай акруговай парт-арганізацыяй, квіт. 415.

Паявая кніжка Васільковага С. С., выд. Бранскім ЦРК, квіт. 418.

Пасьведчаньне аб вайсковай прыгодным, выд. Клімава І. Ф., выд. Гомельскім акруговым ваенкаматам, квіт. 416.

Паявая кніжка за № 95, квіт. 417.

Прафсаюзны білет № 1402 Клімава І. Ф., выд. Саюзам Працасьветы, квіт. 419.

Дакумант аб сацыяльным становішчы, выд. Новаселкаўскім сельсаветам, вайсковы білет, выд. Пухавіцкім райвен каматам на імя Сяротка А., кв. 1106-п.

Пасьведчаньне аб сканчэньні Бабчынскай 9-ай годкі на імя Цімошачыка М. Ф., кв. 437.

Білет члена гарсавету Шамко І. М., выд. Менгартаветам за № 548, квіт. 438.

Пасьведчаньне аб зьніцьці з вучоту Абрамава І. В., выд. Менваенкаматам, квіт. 439.

Пашпарт Танхілевіча Л. Ю., выд. Менгарсавецкім, кв. 440.

Мэтрычны выпіс Хітэровіча Л. З., выд. Менгарсам, кв. 441.

Даведка аб выбарчых правах Шпілеўскага М. С., выд. Байдацкім сельсаветам, Койданаўскага раёну, кв. 442.

Даведка Шпілеўскага М. С., выд. саўгасам імя Сталіна трэсту «Сьзінавод», кв. 443.

Даведка Шпілеўскага М. С., выд. калгасам імя Фрунзэ Байдацкага сельсавету, Койданаўскага раёну, кв. 444.

Членская кніжка Сарока М., выд. саюзам чыгуначнікаў, кв. 445.

Пашпарт Ягоравай А. І., выд. Менскай міліцыяй, кв. 446.

Мэтрычны выпіс Раговіна Я. А., выд. Менгарсам, кв. 447.

Даведка аб адукацыі за № 185 Бардукова В. Я., выд. Дрыбенскай самгоспкай палітэхнічнай школай, кв. 448.

Вайсковая кніжка Ярмалінскага В. І., выд. Слуцкім ваенкаматам кв. 449.

Працоўны сьпіс Жаўнаркевіча Г. А., кв. 451.

Мэтрычны выпіс Розэнталя С. І., выд. Менскім ЗАГС'ам, кв. 453.

Мэтрычны выпіс Росьліка Л. А., выд. Менскім ЗАГС'ам, кв. 454.

Саюзная кніжка Шчарбака Н. Т., кв. 455.

Пасьведчаньне—пропуск Шчарбака Н. Т., выд. нач. охраны кіраўн. сувязі, квіт. 456.

Копія працоўнага сьпісу Шэвердаў П. Г., выд. быўш. Аршанскім Акр. па лясагасаюзам, кв. 457.

Камандыраванае пасьведчаньне Шэвердаў П. І., кв. 458.

Вайсковая кніжка Пачтарэнка С. Д., выд. Азарыцкім РВК, квіт. 263-п.

Паявая кніжка Самусевіча П. У., выд. Шамоўскім опаж. т-вам, кв. 264-п.

Паявая кніжка за № 2984 Зяленка Э. Ш., кв. 265-п.

Вайсковая кніжка Бакінскага, выд. штабам № спр. палком, кв. 266-п.

Картка на каня Казімірэнка С., выд. Багушэўскім РВК, кв. 267-п.

Картка на каня Казімірэнка, выд. Багушэўскім РВК, кв. 268-п.

Членскі білет Каронава Г., выд. Аршанскім дрэваапрацоўнич. за № 628.

Чырвонаармейская кніжка Якубоўскага А. Я., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, квіт. 274-п.

Членская кніжка Шапіро Д. Х., выд. Саюзам Працасьветы, квіт. 420.

Замацаваныя талёны на суму 30 р. пазыкі «5 у 4» на імя Дудкоўскай М. А., квіт. 421.

Дыплём аб сканчэньні плянав. аддзяленьня Наркасу БДУ за № 66 на імя Карпа Я. А., квіт. 422.

Сяброўскі білет за № 1988, выд. Магілеўскім акруговым аддзяленьнем саюзу працасьветы Васілеўскага П. В., кв. 1097-п.

Пасьведчаньне аб сканчэньні Капат кевіцкай 7-мі годкі на імя Жураўля Р. А., квіт. 1098-п.

Вайсковы білет Гуркова А. П., выд. Дрыбенскім вайсковым сталом, паявая кніжка, выд. Дрыбенскай спажыўтавы рыствам № 2405, кв. 1100-п.

Чырвонаармейская кніжка Саўчанка А., кв. 1102-п.

Сяброўскі білет саюзу працасьветы на імя Фішман Б. І., выд. Ельскім РМК саюзу, кв. 1103-п.

Паявая кніжка № 217 Сасноўскага Рабкому на імя Клязовіча Х. А., квіт. 1104-п.

Паявая кніжка за № 17 Вінічэнка Б., кв. 1105-п.

Пасьведчаньне аб сканчэньні 7-мі год кі Тамачова Н. С., выд. Горацкай сямігодкай, кв. 1107-п.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-78, сэктараў —6-15. Выдавецтва—2-44. Выпускаючага 12-65 (два званкі)

Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., 1 год—12 руб.

Упаўнаваж. Галоўлітбела № А—2521.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА